
Блізка людзей —
а. Варсанофій ☞ 3

# Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

АЛЯКСАНДР АСТАПЧУК ☞ 5



http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 18 (2555) Год L | Беласток, 1 мая 2005 г. | Цана 2,00 зл.


*У радасным велікодным захапленні Царква не забывае, што Хрыстос узвялічыўся праз пакуты і смерць...*

## Радасць велікоднай раніцы

**Штогадова перадаецца нам той непаўторны настрой велікоднай раніцы і велікодных дзён. Чаму ўваскрэсенскія званы гучаць весялей за ўсе іншыя званы? Чаму дзеткі з крашанкамі ў пасхальных кошычках радуюць вочы і сэрца? Ці таму, што Вялікдзень асацыюецца нам з прабуджэннем жыцця ў прыродзе? Не! Бо вясна можа спазняцца і можа нават быць брыдкай. Радасць мае іншую крыніцу, бо велікодныя званы спяваюць радасць уваскрэсення, якая знаходзіць водгалас у веры, у надзеі, што Гасподняй міласэрнасцю напоўнена зямля і мы таксама калісь уваскрэснем з мёртвых. Таму і спяваем „Хрыстос уваскрэс з мёртвых, смерцю смерць зваяваў, і тым, што ў магілах, жыццё дараваў”.**


Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

*Міклашы, 1998 год. Пасху асвячае настаяцель Арлянскага прыхода а. мітрат Аляксандр Такарэўскі*

„Я жыву і вы жыць будзеце” — чытаем у Евангеллі ад Іаана. Калі Ісус паміраў на крыжы, усе, што Яго ведалі, а асабліва вучні, засумавалі. Яны баяліся, што іх можа напаткаць такі ж самы лёс. Хаця Ісус гаварыў ім, што Бог уваскрэсіць Яго ў трэці дзень, цяпер аднак, збалелыя, яны пра гэта забылі. Вечарам склалі Ягонае цела ў высечаную ў скале пячору, а да ўваходу прывалілі вялікі камень. Думалі, што Ісус назаўсёды памёр і засумавалі, бо развеялася надзея, якую звязвалі з Ім. Хто не шануе слоў Ісуса, не мае ніякай надзеі.

Божыя планы былі іншыя. Калі жанчыны Саламія, Марыя і Марыя Магдаліна прыйшлі да Ягонай магілы, убачылі яе адкрытую і пустую. У пячоры ўбачылі яны апранутага ў белае анёла, які сказаў ім: „Не бойцеся! Бо я ведаю, што вы шукаеце Ісуса крыжаванага. Яго тут няма. Ён уваскрэс, як і сказаў. Падыдзіце і зірніце на месца, дзе ляжаў Гасподзь. Ідзіце хутчэй і накажыце Яго вучням, што Ён уваскрэс з мёртвых”. Са страхам і радасцю ўспрынялі яны перамогу Хрыста над грэхам і смерцю. Пасля, праз 40 дзён, на Ушэсце, Бог узяў Яго туды, адкуль прыйшоў, да Сябе, у неба, у вечнасць. Усе паміраюць, але Ісус перамог смерць.

У радасным велікодным захапленні Царква не забывае, што Хрыстос узвялічыўся праз пакуты і смерць. Смерць і ўваскрэсенне складаюць тайну збаўлення. Як дзень нараджаецца з цемры ночы, так жыццё нараджаецца са смерці. Наша ноч гэта грэх і смерць. Ісус увайшоў у гэтую ноч разам з намі. Цяпер мы, акунутыя хрышчэннем у Ягоную смерць, уваходзім у новае жыццё жыць для Бога ў Ісусе Хрысце.

У пасланні да карынфянаў апостал Павел пісаў, што калі ўваскрэсення няма, дарэмная і наша вера. Яны сумняваліся ці сапраўды чалавек, які памёр, можа зноў устаць для жыцця. Гэта пытанне не толькі карынфянаў, але і нашае, людзей XXI стагоддзя.

Успышку надзеі прынесла Марыя Магдаліна. У адказ на яе паведамленне пра пустую пячору Пётр і Іаан пабеглі да магілы, а ўбачыўшы там толькі палатніну, паверылі, што Хрыстос сапраўды ўваскрэс.

Марыя Магдаліна, калі ёй паказаўся ўваскрэслы Ісус, напоўнілася радасцю, але яна не ўсвядоміла павагі падзеі, ёй здалося, што Хрыстос стаў толькі больш дасканалым. Толькі Ягоныя словы „Не кранай Мяне” заставілі яе глыбей задумацца пра сэнс здарэння.

Радасны дзень Уваскрэсення канчае ў Праваслаўнай царкве вячэрняе набажэнства, калі чытаецца ўрывак Евангелля. Ён канчаецца словамі „Калі не ўбачу на руках Яго ран ад цвікоў і не пакладу пальца майго ў раны ад цвікоў, і не пакладу рукі маёй у рэбры Яго, не паверу”. Апостал Фама не паверыў, захацеў праверыць, бо ўваскрэсенне Ісуса было абсалютна новым выпрабаваннем. Было яно толькі адчуваннем знешніх пачуццяў у тым сэнсе што бачылі Яго, елі з Ім, размаўлялі, запамяталі Яго навуку. Трансцэндэнтны характар уваскрэсення не паддаваўся апісанню, якога ў Евангеллі і няма.

Вера ў уваскрэсенне не была вытворнай эйфарыі паклоннікаў Хрыста. Сведчыць пра гэта пераканаўча прыклад Саўла з Тарса, ярага ганіцеля маладой Царквы, які, адужаны пад Дамаскам, становіцца Паўлам, найрупліўшым апосталам Ісуса. „Калі вуснамі тваімі будзеш вызнаваць Ісуса Госпадам і сэрцам вераваць, што Бог уваскрэсіў Яго з памерлых, то выбавішся”, пісаў ён у пасланні рымлянам. І гэта будзе нашай велікоднай радасцю, якой ніхто нам не адбярэ.

Уваскрэсенне Хрыстова ўсведамляе нам, што ўяўляны намі канец надзеі дзякуючы Божай міласэрнасці становіцца яе пачаткам. Гэта новы шанс, каб з Уваскрэсеннем пачаць новае жыццё вольнае ад зняволення грахамі. „Калі вы ўваскрэслі з Хрыстом, шукайце таго, што наверсе, а не таго, што на зямлі”, напісаў апостал Павел каласянам.

Чалавек хіба ніколі не спасцігне тайны смерці Богачалавека на крыжы, хаця пра гэта сказана многа глыбокіх і прыгожых слоў. Вялікдзень з’яўляецца чарговай прапановай глыбейшых роздумаў пра Бога ў святле тайны Ісуса Хрыста і паглыблення ў істоту нашай чалавечнасці. Блез Паскаль выказаў цікавае меркаванне: „Калі чалавек пазнае Бога, не пазнаючы сваёй галечы, напаўняецца пыхлівасцю. Калі пазнае сваю галечу, не пазнаючы Бога, падае ў роспач. Пазнаннем Ісуса Хрыста стаем пасярэдзіне, бо ў Ім знаходзім так Бога, як і нашу мізэрнасць”.

**Міхал Мінцэвіч**

*Віншуем нашых Чытачоў з Вялікаднем!*



### Грэшнікі ☞ 2

Яўген Вапа

*У найбліжэйшым асяроддзі Кароля Вайтылы ўвесь час былі агенты бяспекі, сцвярджае Леан Керас, старшыня Інстытута нацыянальнай памяці. Такія пытанні станць і перад Праваслаўнай царквою, калі думаем пра будучыню. Цяжка ўявіць сабе гэта, але і некаторыя нашы духоўныя настаўнікі, мабыць, дзейнічалі са шкодай для Царквы і яе вернікаў — у большасці праваслаўных беларусаў...*

### Адбіраюць свядомасць зямлі ☞ 4

Аляксандр Вярбіцкі

*Калі падаюся ў Сувалкі, там адбіваюцца нястачай часу або гавораць, што на нашы патрабаванні „przepisy nie pozwalają”. Солтысу з Райска чыноўнікі сказалі, што аб’явы пра таргі пасылаюць солтысам. „Я сам солтыс”, — паведаміў ён і іх замуравала. Падазраваючы, што таргі на зямлю адбываліся для аднай асобы...*

### Новая матура ☞ 8

Аляксей Мароз

*У Гайнаўскім белліцэі 114 выпускнікоў закончыла вучобу, а ў Бельскім белліцэі — 154. Усе яны прыступілі да матуральных экзаменаў. З іх ліку 9 ліцэістаў з Гайнаўшчыны і 3 з Бельшчыны з’яўляюцца лаўрэатамі і фіналістамі Алімпіяды беларускай мовы і яны звольнены з экзамену па беларускай мове...*



### Музыкант ☞ д I

Віктар Бура

*Яраслаў Антыповіч: Дапамог мне сябра майго бацькі, Уладзімір Касцючук — псаломшчык у кленіцкай царкве (у прыватнасці, бацька цяперашняга епіскапа Іакава), які наладзіў мой акардэон і запрасіў да сябе на вячоркі. Спадар Уладзімір і ягоны сын Якуб зайгралі разам на баяне і на маім акардэоне. Я іх музыкай быў проста зачараваны...*



# *Хрыстос уваскрос*

*Хрыстос уваскрос! Няма больш светлых, больш моцных, больш абнадзейваючых слоў чым гэтыя. Слоў, у якіх закладзены змест надзеі і збаўлення. Слоў, якія нясуць праўду праз вякі, і самыя з'яўляюцца вечнай праўдай. Блякнуць усе надзённыя праблемы. Нядаўнія турботы, якія здаваліся невырашальнымі, губляюць усялякае значэнне. Няўпэўненасць і сумненні пакідаюць душу, сэрца і розум, знікаюць у сіле падараванага Ім незямнога святла. Хрыстос падняўся з мёртвых і перамог смерць смерцю. Яго бязмежная Любоў паказвае шлях у Вечнасць. Жыццё набывае сэнс. Радуйцеся людзі, радуйся Беларусь.*

*Для беларусаў, як і для ўсіх хрысціян на свеце, гэтае свята заўсёды было сама вялікім і паважаным. Нават у часы савецкай улады, калі на Пасху наўмысна адчыняліся на ўсю ноч клубы і дыскатэкі, каб зманіць моладзь, і каля дзвярэй цэркваў стаялі дружыннікі, каб дэманстратыўна перапісаць прозвішчы ўсіх школьнікаў, якія ідуць туды, і назаўтра пакараць бацькоў за тое, што непаўналетнія дзеці ноччу былі на вуліцы, людзі ўсё адно цягнуліся да храмаў. Ніякія пагрозы не маглі адцягнуць чалавека ад галоўнага, ад патаемных куткоў яго душы, якая патрабавала Божай Ласкі, пазнання Праўды, Веры, Надзеі і Любові. І зараз, як і сотні гадоў таму, традыцыя святкавання найвялікшай для чалавецтва падзеі на Беларусі амаль не змянілася. Усё тыя ж завітанні да сваякоў, трайны пацалунак... Але галоўнае не гэта. Галоўнае, што ў гэты дзень мяняюцца людскія твары, становяцца радаснымі, чыстымі, светлымі... З адбіткам пачуцця чалавечай вартасці і гонару...*

*Б'юць званы храмаў, абвяшчаючы непараўнальную ні з чым веліч падзеі. Гучаць малітвы святароў, славячы Бога і нясучы да Нябёсаў падзякі за нявычарпальную Яго Ласку. Гараць свечкі, запальваючы ў людскіх душах надзею...*

*— Хрыстос уваскрос! — кажа сусед сеседу, і яго твар свеціцца шчасцем.*

*— Сапраўды ўваскрос! — адказвае той, і нізасць, подласць, крывадушнасць, мана, драбязніцтва ўцякаюць з людскіх сэрцаў у свае норы, ачышчаючы свет, падараны чалавеку Творцам.*

*Цалуюцца, па старадаўняй праваслаўнай звычцы, завітаўшы ў госці да знаёмых дарослыя. Весяляцца, гуляючы з пафарбаванымі яйкамі дзеці. Кожны славіць гэты дзень.*

*— Мы будзем жыць як Госпад жыў, — гучна грымяць галасы валачобнікаў.*

*— Мы будзем жыць як Госпад жыў, — падпяваюць ім людскія душы.*

*І душу кожнага наведвае ўпэўненасць, што можна жыць хоць трошкі па-іншаму чым дагэтуль, што нельга разменьвацца на дробязі, што трэба любіць і паважаць кожнага чалавека, дарыць сваю дабрыню ўсім. Так, як гэта робіць Бог, пасылаючы сонечны свет і добрым і злым, і багатым і бедным, і ўладзе і апазіцыі...*

*— Хрыстос уваскрос! — вітае бацька дзяцей, і яго бацькоўская любоў, памножаная на Божую Ласку, адклікаецца ў сэрцах дзяцей шчырым узаемным пачуццём.*

*— Сапраўды ўваскрос! — адказваюць тыя, яшчэ не ахопліваючы сваім малалетнім розумам усёй велічы гэтых слоў, але дакладна адчуваючы іх таямнічае значэнне чыстай дзіцячай душой.*

*— Хрыстос уваскрос! — гаворыць муж жонцы, і суровае сэрца мужчыны напаўняецца каханнем.*

*— Сапраўды ўваскрос! — ветліва адказвае яна, і крыўды, недагаворкі, прэтэнзіі знікаюць за дзвярыма хаты. Застаюцца надзея, каханне, утульнасць...*

*— Хрыстос уваскрос! — вітаецца на вуліцы чалавек з незнаёмым, і яго сэрца поўніцца шчырай радасцю, якой вельмі хочацца падзяліцца з кім-небудзь яшчэ. Бо гэтае ўсёабдымнае пачуццё раскрывае сэрца.*

*— Сапраўды ўваскрос! — гучыць у адказ, і незнаёмыя людзі цалуюць тройчы адзін аднаго як даўнія сябры...*

*— Хрыстос уваскрос! — кажа беларус беларусу. І гэтыя словы ўсяляюць упэўненасць, што ўсе нашы надзеі і спадзяванні збудуцца. Што паменее штодзённых турботаў і клопатаў. Што нам урэшце пашанцуе. Што наша Краіна будзе квітнець у праўдзе і дабрабыце, а наш народ зойме свой пачэсны пасад...*

*І мы можам на гэта ўсё спадзявацца, бо дзве тысячы гадоў таму прыйшоў Той, які бароніць нас і просіць за нас перад Нябесным Бацькам. Бо самы вялікі цуд ужо адбыўся — Хрыстос уваскрос!*

**Віктар САЗОНАЎ (Гродна)**

# *Прабачце нам, грэшным*



*Пашанцавала ў гэтым годзе праваслаўным вернікам у Польшчы са святкаваннем Вялікадня. Выпадае ён на адзін з даўжэйшых уік-эндаў у краіне, прымеркаваных да выхадных з нагоды першамайскіх і трэцямайскіх святкаванняў. Штогадовая магчымасць так доўгіх выхадных, здаецца, зняла цяжар палітызаванасці і гістарычнай нянавісці ў польскім грамадстве паміж прыхільнікамі старога і новага парадкаў, вызначаных умоўна гэтымі датамі. Такім чынам, традыцыйна ачысціўшы раней нашу зямную грэшнасць у перадвелікоднай споведзі, адразу не можам стрымацца, каб ізноў не правініцца. Адвечная зацыкленасць змагання дабра і зла. А Маці-Царква, як папярэднімі двума тысячагоддзямі, заклікае нас, грэшных авечак, да рахунку сумлення, пакаяння і змены паводзін на лепшае.*

*Але калі знаходзімся ў велікодным перыядзе рахункаў сумлення, то нельга забываць вельмі важныя справы ў грамадска-царкоўным жыцці беларускай меншасці, у якіх таксама павінна адбыцца здача грахоў. Справы, якіх нельга замоўчваць — споведзь і ачышчэнне з нашай недалёкай мінуўшчыны. Апублікаваны нядаўна гэтак званы спісак Вільдштэйна нанова выклікаў пытанні пра межы маральнасці і хлусні, палітычнай адказнасці і маніпуляцыі спецслужбаў. Але ўсім стала відавочным, што ад абавязку разлічыцца з гісторыяй не ўхіліцца аніводзін народ і яго структуры. Са спазненнем, але перамеле ён і беларуска-праваслаўную грамадскасць.*

*Тое, што шаснаццаць гадоў у Польшчы адтэрміноўваліся і скрываліся гэтыя працэсы, гэта параза і кампраметацыя палітычных элітаў пасля 1989 г. Давялі яны між іншым да зняверлівасці да ўлад і справядлівасці дэмакратычных устаноў. Самае горшае — гэта адабранне ў людзей надзеі ў сэнс змагання за свае правы і лепшую будучыню. Каб жыць і марыць, маладым і старым трэба ізноў з'язджаць за мяжу. Але ўсё ёсць добра. На банкетных залах і ў „незалежных" медыях правадыры дзяржаўнай і самаўрадавай бюракратыі апавесцяць толькі пра поспехі гадавога членства ў Еўрасаюзе. У нядаўнім мінулым многія з іх усхвалялі пабудову сацыялізму і рэгулярна падымалі тосты за польска-савецкую дружбу. На нашым беластоцка-беларускім панадворку змагаліся яны паспяхова з кожнай праявай беларускай і царкоўнай самастойнай думкі. Зараз яны цывілізавана трансфармаваліся ў паважаных лакальных самаўрадавых і царкоўных саноўнікаў, прыкладна наведваюць царкву і беларускія фэсты дзеля выбарчых інтарэсаў.*

*Нацыянальныя і рэлігійныя меншасці знаходзіліся і знаходзяцца пад дакладным наглядам і ўвагай спецслужбаў. Так як палякі шукалі сваіх прозвішчаў на выяўленым спіску, беларускае асяроддзе таксама адшукоўвала знаёмых. Я тут згодны, што гэты спісак мог часта быць фальсіфікаваны спецслужбамі. Галоўнай хібай гэтага спіска і люстрацыйнага працэсу ёсць тое, на маю думку, што даносчыкі і стукачы ў беларуска-праваслаўным асяроддзі, якія былі імі да 1989 г., і надалей застаюцца інфарматарамі— не выяўлены. Яны, паводле сённяшняга інтарэсу ўлады, зараз таксама выконваюць адказную грамадзянскую справу. А тыя, якія цяпер аказаліся ўжо ім непатрэбнымі, можна спакойна „адстрэліць", публікуючы іхнія даныя. У дачыненні да некаторых асоб, якія зацікаўлены сваім мінулым, папкі быццам бы загінулі пасля 1989 г. Як гавораць спрактыкаваныя ў архіўнай справе людзі, змянілі яны толькі новых уласнікаў, якія надалей запісваюць і адсочваюць дзеянні такіх асоб. Таксама вядомых і паважаных сёння на Беласточчыне грамадскіх і самаўрадавых дзеячаў, якія не скрываюць, што ў мінулым працавалі ў службе бяспекі, няма ў большасці на спіску. Усё гэта стварае насцярожанасць, што ў любы момант такія асобы могуць быць інструментальна выкарыстаны па палітычным заказе для іх кампраметацыі ці асяроддзя, у якім дзейнічаюць. Сітуацыя робіцца яшчэ больш складанай у дачыненні да асоб духоўнага сану, святароў ці епіскапаў. У найбліжэйшым асяроддзі Караля Вайтылы ўвесь час былі агенты бяспекі, сцвярджае Леан Керас, старшыня Інстытута нацыянальнай памяці. Такія пытанні стануць і перад Праваслаўнай царквою, калі думаем пра будучыню. Цяжка ўявіць сабе гэта, але і некаторыя нашы духоўныя настаўнікі, мабыць, дзейнічалі са шкодай для Царквы і яе вернікаў — у большасці праваслаўных беларусаў.*

*Божа, прабач нам, грэшным, — застаецца толькі вымаўляць словы малітвы.*

**Яўген ВАПА**

**Вачыма еўрапейца**

# *Нервовыя пагрозы*



*У прынцыпе выказванні прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі не павінны здзіўляць. У апошні час, аднак, можа скласціся ўражанне, што кіраўнік Беларусі перайшоў самога сябе. У звароце з пасланнем беларускаму народу і Нацыянальнаму Сходу аб стане дзяржавы, якое тэлебачанне транслявала ў прамым эфіры — як акрэслілі гэта польскія СМІ — жорстка атакаваў Польшчу, а польскіх дыпламатаў абвінаваціў у падрыхтоўцы перавароту. Запэўніваючы, што ў ягонай дзяржаве не дойдзе да ніякай каляровай рэвалюцыі, і што апазіцыя аплачваецца выключна Захадам, гаварыў:*

*— Гэта навязаны і аплачаны звонку бандытызм. Учынены ён па заяўцы і каб дагадзіць тым, якія не маюць справы да краіны і народа, якіх цікавіць толькі задавальненне сваіх імперскіх амбіцый, захоп новых рынкаў. Магчыма, камусьці не падабаецца наша незалежнасць. Але адмаўляцца ад яе, тым больш прадаваць яе, мы ніколі не станем. (...) Я хачу папярэдзіць, і не палічыце гэта як пагрозу, пасольства Польшчы. Мы ведаем, што тварыцца ў пасольстве, ведаем вашу работу! Не думайце, што палякі ў Беларусі — гэта не грамадзяне Беларусі! Гэта нашы грамадзяне. Не дамо іх у крыўду нікому і мазгі пудрыць вы ім таксама не будзеце.*

*Назваў тут палякаў з Палесся. „Варожая" работа — на думку прэзідэнта Лукашэнкі — мае праводзіцца таксама пры ўдзеле Каталіцкага касцёла.*

*— Каталікі — гэта нашы каталікі. Мы іх не ўшчамляем. Мы здаўна ведаем, што будзеце націскаць на тую частку нашага насельніцтва, каб дэстабілізаваць сітуацыю.*

*Польскім дыпламатам у Мінску паставіў ён ва ўзор паслоў Расіі, Туркменіі і Арменіі. Як прыгадала „Выбарчая газета", пасол Туркменіі Ілья Вельджанаў гэта былы савецкі генерал, які паўтарае: „Я нарадзіўся камуністам і хацеў бы камуністам памерці".*

*Дасталася таксама ўкраінцам („ствараюць лагеры", адкуль будуць перакідвацца на Беларусь рэвалюцыянеры), ну і, вядома, амерыканцам.*

*Зараз на гэтыя выказванні адрэагаваў першы старшыня дэмакратычнага Вярхоўнага Савета, адзін з лідэраў сённяшняй апазіцыі, Станіслаў Шушкевіч:*

*— Лукашэнка заатакаваў Польшчу і Украіну, таму што баіцца за сваю ўладу. Ён усюды шукае ворагаў, бо ведае, што аранжавая рэвалюцыя можа адбыцца таксама і ў нас. Можа будзе мець яна іншы колер, але яе прыход — няўхільны.*

*— Форма скандалічная, а змест не мае сэнсу, калі казаць без цырымоніі, — пракаментаваў выказванне прэзідэнта Лукашэнкі маршалак Сейма Уладзімеж Цімашэвіч. — Гэтыя выказванні нягодныя кагосьці, хто займае пасаду прэзідэнта.*

*Прэм'ер Марэк Бэлька назваў іх нечуванымі і несумяшчальнымі ў еўрапейскіх стандартах. Міністр замежных спраў Адам Ротфельд у сваю чаргу ацаніў іх так:*

*— Гэта тыповае для недэмакратычных сістэм, якія, калі ў іх узнікаюць унутраныя праблемы, шукаюць ворагаў вонкі.*

*Таксама дзяржсакратар ЗША Кандаліза Райс, быццам пры нагодзе, аднеслася да сітуацыі ў Беларусі. Назвала яна сённяшні рэжым „апошняй дыктатурай у Сярэдняй Еўропе":*

*— Прыйшоў час на змены.*

*Некалькі дзён раней міністры замежных спраў краін ЕС дайшлі да вываду: „Не можам адабраць факту, што краіна ў межах Еўропы беспаваротна пагружаецца ў дыктатуру".*

**Мацей ХАЛАДОЎСКІ**

# Блізка царквы і людзей

**Пра Цуд Божага Уваскрэсення, традыцыю і сучаснасць з айцом ВАРСАНОФІЕМ (Дарашкевічам) — архімандрытам мужчынскага праваслаўнага манастыра ў Саках гутарыць Ганна КАНДРАЦЮК.**

***— Айцец архімандрыт, чаму праваслаўныя адзначаюць Вялікдзень, каталікі — Вялікую ноч (Wielkanoc)?***

— Царкоўнае паняцце свята — гэта Пасха. Слова *Вялікдзень* мае народны і сімвалічны характар. Чаму кажам — Вялікдзень? Таму, што ноч Уваскрэсення Хрыста перастае быць ноччу і становіцца днём. Хрыстос зыходзіць у пекла і там перамагае смерць, ноч аб'ядноўваецца з днём, цемра пераходзіць у яснасць.

Што такое Пасха? Мы ведаем, што ноччу перад выхадам яўрэяў з Егіпта, праходзіў анёл смерці. Майсей загадаў, каб кожная сям'я зарэзала ягня і каб ягонай кроўю пазначыла касякі дзвярэй. Бо там, дзе не было гэтага знака, меў памерці кожны першынец. Вось гэты пераход анёла смерці праз Егіпет, пасля пераход яўрэяў праз Чырвонае мора, ды вандраванне праз сорак гадоў па пустыні — ёсць і Пасха. А сімвал Новай Пасхі — гэта пераход ад смерці да жыцця.

***— Нас цікавіць роля традыцыі. Найбольш жывы пераказ. Ці Вы, як сын святой памяці дарагога нам мітрапаліта Варшаўскага і ўсяе Польшчы Васілія, маглі б расказаць пра Вялікдзень у часы Вашага дзяцінства?***

— Мой успамін Вялікадня вельмі прыемны. Падрыхтоўка пачыналася ўжо з першага дня Вялікага посту. Мама чысціла ўсе гаршкі, каб і кропелькі тлушчу на іх не асталося. Пост то быў пост. Ніхто нам не тлумачыў, чаму так а не інакай сябе паводзім, гэта была нармальнасць. Не было такога адкідання — што я не хачу і ўсё! Калі я пайшоў ужо ў духоўную семінарыю, там пачаў чытаць пра ролю посту, яго значэнне. У той час, калі тата быў на парафіі ў Гарадку, усе людзі пасцілі. Ну, хіба, хто моцна партыйны — той ужо падсмейваўся.

Мы, дзеці, найбольш чакалі Вялікадня. Перад святамі калолі парсючка і мама гатовіла ўсе *выробы*, — каўбасы, паляндвіцы, бачкі... Калі мы, звабленыя пахам вэнджанага круціліся каля вяндліны, мама ўпаміналa — глядзіце, толькі каб мне нічога не падскубвалі! Гэта ўсё на Вялікдзень. Рыхтавалі многа-многа яды, мама пякла святочны пірог-пасху, такі з бакалейнымі прыправамі, самы смачны які я еў. Ён быў крыху іншы як наш традыцыйны, па рэцэпту жонкі нашага псаломшчыка; яны былі з Украіны.

У Вялікую суботу мне даручалі кошык і я ішоў у царкву асвяціць яйкі. Памятаю, стаяла чарга да дзвярэй, даўжэзная, на які кіламетр. Колькі там круцілася дзяцей! Хоць не надта было можна адарвацца ад абавязкаў, цэлы дзень трэба было дапамагаць у хаце. Мы з сястрой замяталі панадворак, наводзілі апошнія парадкі. Паўсюдна адчувалася, што ідзе свята...

Самы радасны і шчаслівы момант для мяне — Пасхальная ноч. Тая радасць была такая з неба, самая з сябе. Людзі адчувалі, што Хрыстос



Фота МІРЫ ЛУКШЫ

**Архімандрыт ВАРСАНОФІЙ (Дарашкевіч), нарадзіўся ў 1956 годзе. Вучыўся ў вышэйшых духоўных установах у Польшчы, ЗША, Францыі і Грэцыі. Доктарскую дысертацыю прысвяціў тэме „Дыялогу Праваслаўнай царквы з касцёламі дахалкідонскага перыяду". З 16 ліпеня 2001 г. арганізуе манастыр у Саках. Да гэтага часу быў прарэктарам Варшаўскай Праваслаўнай духоўнай семінарыі, выдатным і любімым настаўнікам ды выхавацелем будучых праваслаўных святароў. Валодае сямю мовамі.**

Уваскрос! Я перажываў дадаткова, бо з самых маладых гадоў чытаў на Усяночнай *Апостала*.

У гэтую святую ноч вакол царквы ўсё ажыўлялася. Памятаю, як стаялі ўсюды коні з вазамі, бо яшчэ не было самаходаў.

Святкавалі тры дні. У першы дзень Пасхі, пасля снедання, крыху спалі. Пасля мы, дзеці, збіраліся ў кампанію і гулялі ў *качалкі*. Бывала, возмеш з хаты дзесяць-пятнаццаць яек і ўсе прайграеш, а часамі... трыццаць выйграеш і прынясеш дадому. Гэтую гульню з вялікай радасцю ўспамінаю... хоць і не раз дастаў добра. Бо выйшаў з хаты прыгожа адзеты, а там набярэш поўныя кішэні яек — яны разальюцца, пройдуць праз новы касцюм — і бяда. Страх было тады вяртацца. Вядома, што добра адлупцуюць. Тады не было так, як цяпер — вопратку шанавалі, цяжка яе было нажываць.

***— А ці атрымоўвалі Вы валачобнае ад хросных бацькоў?***

— Не, яны жылі далёка. У нас заўсёды было многа гасцей, і часам нехта прыносіў валачобнае, і было добра. На Вялікдзень мама рыхтавала яду не адно для сям'і і гасцей. Быў такі звычай, што да нас заходзілі бедныя, і яны ніколі не выйшлі з пустымі рукамі. Мама сама рабіла такую карзінку — клала туды яйкі, каўбаску, кусок шынкі і казала мне: *Дзіця, ідзі і занясі бабцы Натальцы. Яна нікога не мае*. Калісь не было пенсій, кожны ведаў што старым трэба дапамагаць. І самі людзі былі іншыя, калі хадзілі і збіралі на царкву, то да залатоўкі аддавалі, нават як самі галадалі. Я памятаю, як мама мяне навучала, што калі прыходжу ў школу і маю *канапку*, то каб першы не еў, толькі паглядзеў навокал і спытаў ці можа нехта галодны, і каб падзяліцца з ім.

***— Вы нарадзіліся ў Гарадку?***

— У Рыбалах. Аднак дзяцінства мне спалучаецца з Гарадком. Мы пераехалі туды, калі мне было пяць гадоў. У Гарадку я ўсіх ведаў, усе былі або дзядзькі, або цёці.

***— Скажыце яшчэ пра родны дом, як Вас выхоўвалі бацькі: айцец Васілій і матушка Елена?***

— Мы жылі паводле царкоўнага календара. Як усе людзі. У нас цэлы год была праца. Прыходзілі канікулы — было сена, жніво і трэба было працаваць. Яксьці не прыходзіла ў галаву, што ўсе ідуць працаваць, а бацюшка сядзіць ды выглядае, што нехта прынясе яму курыцу ці што добрае. Не было такога думання. Свяшчэннік працаваў і з вялікай пашанай да працы адносіўся. Вядома, гэта не была вялізная гаспадарка. Як зараз гляджу на маіх вучняў у семінарыі — прыйдуць канікулы і ўсе едуць дзесьці адпачываць, найчасцей за мяжу. Не ведаюць ні вёскі, ні фізічнай працы. Ведаеце, я толькі раз быў на *калёніі* ў Мельняках (7 кіламетраў ад Гарадка — Г. К.). І гэта сястра ў бацькоў выпрасіла. Мы паехалі туды на два тыдні. То мама кажа — хай хутчэй вяртаюцца, бо атаву трэба касіць... Першы раз я пабачыў горад, як паехаў вучыцца ў семінарыю ў Варшаву. Нашае жыццё было простае, вельмі шчаслівае.

***— Сучасны чалавек усё часцей свята праводзіць за багатым сталом і тэлевізарам. Айцец архімандрыт, падкажыце як трэба адзначаць Вялікдзень?***

— Галоўнае — быць блізка царквы і людзей. Найлепш паехаць да дзядоў і бабуль у вёску. У вёсцы, на прыродзе, чалавек адчувае, што ён — частка прыроды. Вядома, не ўсе могуць паехаць на вёску. Тады трэба на месцы падрыхтавацца да Пасхі. Трэба пасціць. Выключыць тэлевізар, не слухаць агрэсіўнай музыкі, не забаўляцца, вольны час прысвяціць на духоўныя кнігі. Вядома, трэба схадзіць у царкву. Пасля, наведваць блізкіх, не дапускаць, каб між намі зацяралiся сямейныя сувязі. У нас бывае так: паелі, выпілі і пайшлі спаць. І ўсё. Так нельга. Калі ў нас няма сям'і, няма блізкіх, добра ўзяць яйка і пайсці ў бальніцу, наведаць самотных людзей, у якіх ужо нікога няма. Або ў сірацінец і занесці дзеткам валачобнае.

У Пасхальны дзень усе павінны радавацца, таму мы абавязаны памятаць пра самотных дзеда ці бабулю, нават калі не належаць да нашай сям'і. Папытацца пра здароўе, ці можа чаго ім трэба?

Самае страшнае — лічу — сесці і глядзець тэлевізар. Тэлевізар забівае людскія пазітыўныя інстынкты.

***— Царква ў Саках звязаная з культам св. Дзмітрыя Салунскага, які ў нас падчынены пад памінальныя восеньскія святы. Я хачу спытаць пра культ памерлых у Пасхальны перыяд.***

— Гэта ёсць перыяд, калі няма духовай смерці. Бо, ведаем, што Хрыстос праз сваю смерць сыходзіць у пекла і там сваёй ласкай перамагае смерць. Тое, што заўсёды здавалася нам пеклам, смерцю — перастае існаваць. Мы аб'ядноўваемся тады з нашымі продкамі, і не як з памерлымі, а як з тымі, што таксама ўдзельнічаюць у перамозе Хрыста над смерцю. Мы ж не спяваем „Упокой Господи душу усобшего раба" — толькі „Хрыстос Уваскрос"!

***— Як у манастыры сустрэнеце Вялікдзень?***

— Перад намі Вялікі тыдзень — многа службаў. Ну, тут у манастыры мы мяса не ямо. На нашым стале будуць яйкі, рыба. Можа нехта спячэ нам пасху. Кожны год да нас прыязджаюць знаёмыя дактары з Варшавы і яны нам заўсёды гатуюць рыбны суп. Гарэлкі не п'ем, але будзе віно, так што будзем радавацца. І прыходзяць людзі. Многа людзей да нас прыходзіць. Я хачу сказаць, што тут людзі вельмі добрыя. Мы ніколі не купляем яек, ні нічога... Усё што патрэбнае для жыцця — людзі прыносяць. Яны ведаюць, што трэба падзяліцца. І такія царкоўныя ўсе. Калі я раз спытаў аднаго чалавека з Тапаркоў як яны тут захаваліся, ён адказаў жартам: *Бо ведаеце, бацюшка, праз нашу вёску ніколі аўтобус не праязджаў!*

У гэтых словах ёсць пэўная праўда. Мясцовыя людзі захавалі яшчэ стыль нашых праваслаўных продкаў, зберaглі такую праўду пра чалавека. Яны такія самыя як і іх жыццё.

***— Колькі ў Саках зараз манахаў?***

— Нас усіх пяць, хоць зараз чатырох, бо адзін адкамандзіраваны ў Варшаву. Папраўдзе, наш манастыр самы бедны, таму што ў нас няма зямлі. Але ўжо мы купілі ў Залешанах домік з паловай гектара. Для нашых патрэб хопіць. Хочацца ўжо нешта пасеяць, вырасціць сваё...

**Размаўляла Ганна КАНДРАЦЮК**

## Каму верыць?

Пад канец лютага „Газета выбарча” напісала, што пенсіянеры, якія атрымоўваюць мінімальную пенсію 562,58 зл., дастануць 41 зл. кампенсацыі і 100 зл. аднаразовага дадатку ў рамках ліквідацыі пенсій г.зв. старога партфеля. Хаця ўсе пададзеныя ў газеце ўмовы я выконваю (з’яўляюся інвалідам першай групы, мне 78 гадоў, дастаў 41 зл. кампенсацыі), аднак 100 зл. дадатку мне не далі.

Тэлефанаваў я ў ЗУС і КРУС, дзе мне адказалі, што ніякіх 100 зл. мне не належыцца. Тады ўзнікае ў мяне пытанне: чаму так, калі гэты дадатак належыцца 75-гадоваму інваліду, які атрымоўвае мінімальную пенсію? Навошта ашукваць старых людзей? Набліжаюцца парламенцкія і прэзідэнцкія выбары, а нам, пенсіянерам, такую дулю пад нос сунулі. Так мы і галасаваць будзем! Як так далей пойдзе, то пэўна забяруць нават гэтыя сорак злотых кампенсацыі.

**Дзядзька Захар**

## Ці купляем здаровыя харчы?

Летась на тэрыторыі Бельскага павета пад наглядам тамашняй Павятовай санэпідэмстанцыі было 405 харчавальных аб’ектаў. Працаўнікі ўстановы правялі 887 кантроляў і рэкантроляў, у 313 выпадках сцвярджаючы парушэнне дзейных харчавальных законаў. Віноўныя былі пакараны 49 адміністрацыйнымі штрафамі вартасцю ў 7 250 злотаў і 11 судовымі вартасцю ў 3 450 злотаў.

Паводле дакументаў Бельскага староства найбольш клопатаў дастаўляе раз’язны гандаль, які адбываецца ў выпадковых месцах, прапануючы пакупнікам нетрывалы тавар, незагорнуты, падвергнуты паўторнаму забруджванню, утрымліваны ў неадпаведных тэрмічных умовах. Гэтая праблема павінна больш цікавіць гмінныя ўправы, якія даюць дазволы на такую дзейнасць. **(мм)**

## Пачакальні ПКС

У Нарве і ў Нарваўскай гміне на шляху Беласток — Гайнаўка брудныя ды неахайныя пачакальні на прыдарожных аўтобусных прыпынках ПКС. Найгорш выглядае пачакальня ў цэнтры Нарвы: яе даўно не малявалі, а пад дашком дзве нізенькія лавы ды адна паркавая лавачка, няма раскладу ад’ездаў аўтобусаў ПКС.

Гмінныя ўлады павінны больш паклапаціцца таксама пра вонкавы выгляд пачакальняў у Макаўцы, Храбустоўцы, Кутавой і Ласінцы. **(мох)**

*Словы шчырага спачування*
*Ірэне ПАРФЯНЮК*
*з прычыны напаткаўшага яе гора*
*— **смерці бацькі** —*
*выказваюць*
*Управа Фонду „Царкоўная музыка”*
*і Таварыства аховы краявіду*
*ў Гайнаўцы.*

# Адбіраюць нашу зямлю


*Ян Мордань: Амаль з усіх бакоў кідаюць нам калоды пад ногі...*

Калісь Ленін пісаў, што „мелкое производство рождает капитализм и буржуазию постоянно, ежедневно, ежечасно, стихийно и в массовам масштабе”. Ягоныя эпігоны дадавалі: „Работая в обособленном мелком единоличном хозяйстве, крестьянин поневоле был проникнут частнособственническими настроениями. Колхозный строй является важнейшим средством перевоспитания крестьянина”. У „Ніве” ад 29 красавіка 1956 года пісалася: „У вёсцы Гацькі з восені 1950 года існуе сельскагаспадарчы кааператыў, які налічвае 150 членаў. Спачатку не ўсе жыхары вёскі прыхільна адносіліся да кааператыва. Аднак потым варожасць гэта знікла, таму што людзі пераканаліся аб вышэйшасці калектыўнай гаспадаркі ад паасобніцкай”. У тым жа 1956 годзе таварыш Гамулка зняў прыярытэт з калектывізацыі сельскай гаспадаркі ў Польшчы, аднак сацыялістычны строй астаўся і крыху пазней зноў адрадзіўся ў нас націск на абеззямельванне зямляробаў.

Пасляваенныя калектывізатары з задорам накінуліся на беларускія вёскі Беласточчыны. Тут быў для гэтага добры грунт, бо з бежанства людзі вярнуліся на голы камень, прывозячы з сабою рэвалюцыйны опіум для маладых мас, а галеча санацыйнага перыяду і ваенная перамога саветаў спрыялі мацаванню ў нас культу расійскіх ідэалагічных выдумак; нейкую ролю сыграў і рэлігійны атавізм. Індустрыялізацыя і калектывізацыйны захоп зямельнай уласнасці знеахвочвалі вяскоўцаў да гаспадарання, адпраўляючы іх нашчадкаў у гарады. На зямлі нярэдка аставаліся тыя дзеці, якім навука давалася тугавата, часта не аставаўся ніхто. Калі геркаўскія ідэолагі падкупнымі сродкамі далі ход рэцыдыву аграмаджвання зямлі, нашы людзі сталі масава яе пазбывацца. Дзяржаўны арэал рос і ў выніку адміністрацыйнага раззямельвання; была і зямля пакінутая пасляваеннымі эмігрантамі на ўсход. Наша дзяржава за чужыя грошы стала гаспадарыць на гэтак выцыганенай зямлі. Да часу, пакуль грошыкі скончыліся. Зямлі трэба было знайсці новага гаспадара.

У Гацьках, што ў Бельскай гміне, калгас распаўся неўзабаве пасля згаданага „знікнення варожасці” да яго. Пасля яго беражным яшчэ сялянам асталіся нейкія грошы, якія яны задумалі прызначыць на сушыльню, школу і вясковы клуб. Тыя грошы ў выніку бюракратычных махлярстваў недзе зніклі. Хадайнічаць за іх вяртанне вёсцы стаў настаўнік Генрык Дамброўскі, аднак яго падстрэлілі на паляванні і людзі гэта пракаментавалі, што „lepiej z władzą nie zadzierać”.

У геркаўскі час у Бельску быў арганізаваны пэгеэр, якому выдзялілі захопленую дзяржавай зямлю ў навакольных вёсках, м.інш. у Парцаве, Райску, Храбалах, Праневічах, Дыдулях, Гацьках... Мясцовыя сталі наймацца ў той пэгеэр, а людзям звонку быў у Гацьках пабудаваны блёк на месцы царскай яшчэ школы. У палове 70-х гадоў у Гацьках правялі камасацыю дзяржаўных грунтаў, прымусова і мэтанакіравана раздробліваючы ўцалелыя індывідуальныя гаспадаркі, забіраючы пад пэгеэр найлепшую зямлю. Бацькам Уладзіміра Васілюка пад пэгеэр забралі іх шасцігектарны ўчастак побач сядзібы, даючы ўзамен тры раскінутыя кавалкі. У іншага гаспадара 19 гектараў „скамасаваны” ў трынаццаці кавалках.

Бельскі пэгеэр праваліўся і ў 1993 годзе яго развязалі. Колішняя зямля мясцовых сялян перайшла ва ўладанне Агенцтва сельскагаспадарчай маёмасці казны і ёю сталі на невядомай аснове карыстацца невядомыя людзі звонку, а мясцовыя даведаліся пра новыя парадкі пасля фактаў. Калі земляробы з Гацькоў сталі патрабаваць сабе гэтай зямлі, чыноўнікі пачалі ставіць перад імі фінансава недаольныя бар’еры, напрыклад, каб заміж патрэбных ім 5, 10 ці 50 гектараў, куплялі яны цэлы 300-гектарны ўчастак, гаворачы, што гэта „całość”. Адзін чалавек хацеў адкупіць бацькоўшчыну, аднак яе яму не прадалі, толькі аддалі надлясніцтву, якое хацела той участак аблясціць, але высветлілася, што гэтага рабіць нельга.

— І навошта мне гэта ўперлі? — развёў рукі надляснічы.

— Амаль з усіх бакоў кідаюць нам калоды пад ногі, — кажа Ян Мордань, старшыня гацькоўскага таварыства „Гай”. — Калейковіч, бельскі адміністратар ад Агенцтва, робіць з зямлёю што хоча. Аддзел Агенцтва ў Сувалках прыслаў паведамленне, што ў Храбалах прадаецца 22,7 гектара зямлі, а ён, што гэта не для продажу. Калі падаюся ў Сувалкі, там адбіваюцца нястачай часу або гавораць, што на нашы патрабаванні „przepisy nie pozwalają”. Солтысу з Райска чыноўнікі сказалі, што аб’явы пра таргі пасылаюць солтысам. „Я сам солтыс”, — паведаміў ён і іх замуравала. Падазраваючы, што таргі на зямлю адбываліся для адной асобы ў кабінеце дырэктара, запатрабаваў я ў Сувалках пратаколы таргоў, у выніку якіх была размеркавана наша зямля, дык у адказ пачуў, што яны ў архіве. Калі я звяртаўся за дапамогай да пасла Чыквіна, ён мне раіў: „А дайце спокуй, бо то цяжкая справа, нічога не атрымаецца”. Але ўсё ж такі ён крыху памог. Ён разам з Юргелем і Загурскім паўплывалі на тое, што згаданы вялікі ўчастак Агенцтва падзяліла на дзесяць меншых і частку з іх абрабляюць ужо мясцовыя. Прыклаўся да гэтага і маршалак Талвінскі, які нам сказаў лічыць спадчыну сваёй і не здавацца, бо выгрызуць. Хадайнічаў і ваявода Стшалінскі, дапамогу дэкляраваў нам і боцькаўскі войт Дэрэгайла. А вось нашы павятовыя і гмінныя ўлады злосныя на нас, што не здаемся. Ранейшы бельскі войт Ігнацюк сказаў быў мне: „Гэтым будуць займацца разумнейшыя за цябе людзі”. Ды і Беларускі самаўрадавы форум у Бельску адбіваецца ад нас як можа. Чакаюць, што сяляне выгараць...

Сяляне з Бельскай гміны дабіліся разгляду справы сваёй зямлі 26 лістапада 2003 года ў Камісіі нацыянальных меншасцей Сейма, прабуючы падцягнуць справу пад ахову сваёй беларускай спадчыны. Вынік такі, што дзеянні Агенцтва прызнаны законнымі нават паслом Кролем, якога спадчына прыхавалася далёка ад Масквы, затое ж пасол Чэрвінскі з забужан упікнуў: „Najgorsze jest to, że osoby, które brały w tym udział (у раскулачванні — А. В.) lub są ich ideowymi potomkami, obecnie starają się być obrońcami”. Можна апраўдвацца, што не толькі „нашы хлопцы” вялі змаганне за перавыхаванне сялян, што другі канец іхняга павадка заўсёды бегся ў чужых руках...

Закон пра гаспадаранне сельскагаспадарчымі нерухомасцямі казны ўскладвае на Агенцтва задачу паправы абшаравай структуры сямейных гаспадарак. Артыкул 9 таго закону права на набыццё нерухомасці ў першую чаргу адводзіць яе **былому ўласніку або ягоным спадкаемцам.** І дух гэтага закону выразны. А як гэту задачу выконваюць чыноўнікі таго Агенцтва і нашых самаўрадаў? А пішуць або і не пішуць пісульку пра таргі, паказваюць яе або і не паказваюць сялянам, зусім не цікавячыся выкананнем закону і першачарговым паведамленнем былых уласнікаў. Не тайна, што ў шматлікіх адміністрацыйных установах сядзіць процьма людзей, якія мучацца ад нечага рабіць. Адкуль іх там столькі набралася? Шмат хто з іх з’яўляецца панам або панюсяй з нашага мужыцкага роду, што прыйшлі ў бюро прасядзець восем гадзін. Ці ж пасол Чэрвінскі не мае бачанай у іншым аспекце рацыі? **Каля Ломжы тамашняя адміністрацыя шукае былых уласнікаў і спярша ім прапануе куплю спадчыннай зямлі...**

Нашым земляробам улады дзесяцігоддзямі адбіралі свядомасць зямлі. І немагчыма яе вярнуць праз тыдзень або два, якія адводзяцца для паведамлення аб таргах на іх законную спадчыну. Рэкультывацыя зямельнай свядомасці, каб правесці вясковыя сходы, каб вярнуць прывязанасць да карміцелькі, патрабавала б нямала часу. Але каму да гэтага справа: паслам, радным, чыноўнікам, што адбіліся ад зямлі? Паказваць сваю інтэграванасць мы пакідаем на адзін толькі дзень у год — на 19 жніўня... У Гацьках і некаторыя сяляне папракаюць Яна Морданя: „Калі б не ты, дык мы спакойна пайшлі б да каго да работы!”

**Аляксандр Вярбіцкі**

# Беларускі гаспадар

**Аляксандр АСТАПЧУК з Новага Корніна пастаянна разбудоўвае сваю гаспадарку і павялічвае сельскагаспадарчую прадукцыю. Ад многіх гадоў займаецца ён таксама грамадскай дзейнасцю. Хутка міне 30 гадоў як выконвае абавязкі гміннага раднага. У Радзе апошняга скліканя засядае ад імя Беларуска-народнага выбарчага камітэта. З'яўляецца таксама старшынёй вясковай добраахвотнай пажарнай каманды.**

— Я — беларус, а гэта накладвае свае абавязкі. Таму і пайшоў я на выбары ад імя Беларускага камітэта. У маёй вёсцы выдатная большасць дзетак вучыцца беларускай мове. Гэта абавязак бацькоў дапільнаваць, каб іх дзеткі вучыліся ў школе па-беларуску, — кажа Аляксандр Астапчук, які сустракае мяне перад сваім вялікім панадворкам.



Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

*Аляксандр Астапчук купіў вялікія трактары, каб паскорыць працу ў полі*

Паменшала рэнтабельнасць раслінаводства. На панадворку стаіць некалькі трактароў і вялікая грузавая машына „Вольва" для перавозу збожжа. Апошнім часам цяжка прадаць збожжа і таму сын гаспадара, Юрый Астапчук, возіць яго прадаваць у аддаленыя месцы ў Польшчы. Возіць таксама збожжа суседзям.

— Напрацаваліся мы ў час апошняга жніва і няма эфектаў. Ужо ў жніво збожжа было таннае, а зараз яшчэ больш патанннела. Цяпер тона пшаніцы каштуе 380 злотых (у жніво каштавала 430 злотых). За збожжавую мяшанку плацяць толькі 220 злотых. У гэты час мінеральныя ўгнаенні падаражэлі на 20%. Тыя гаспадары, што рашыліся захоўваць у сябе збожжа, многа патрацілі. Добра, што плён у мінулым годзе быў добры. У мяне атрымалася па 5-5,5 тоны пшаніцы з гектара, — гаворыць спадар Аляксандр. — Аднак прыбытковасць ад прадукцыі збожжа невялікая. Зараз трэба прадаць 2-3 тоны пшаніцы, каб купіць тону мінеральнага ўгнаення. За тону пшаніцы можна было купіць 2-3 тоны ўгнаення. Усе даплаты да раслліннай прадукцыі трацім на павышаныя кошты вытворчасці. Ад часу ўваходу Польшчы ў Еўрасаюз цэны на машыны і мінеральныя ўгнаенні павысіліся на 50%, а збожжа вельмі патаннела. Каб можна было пражыць з раслліннай прадукцыі, трэба купляць дадатковую зямлю.

Рашыўся ён на куплю зямлі і машын. Аднак спадар Аляксандр Астапчук не здаецца. Разам з жонкай Верай, сынам Юрыем і з дапамогай зяця Андрэя Секана гаспадарыць на 90 гектарах зямлі, дзе 38 гектараў гэта арандаванае поле. Не выступаў ён за дадатковымі даплатамі на куплю машын або зямлі. Толькі сын Юрый, як малады гаспадар, выступіў за ўспамогай. Спадар Аляксандр Астапчук гадуе 120 авечак. Аднак ад гэтай гадоўлі невялікая прыбытковасць. За кілаграм воўны плацяць толькі 3 злоты. Сырая авечая шкура каштуе каля 10 злотых. Невялікі прыбытак дае продаж ягнят. Італьянцы плацяць па 8-10 злотых за кілаграм іх жывой вагі. Аднак продаж ягнят з'яўляецца асноўным прыбыткам ад авечкагадоўлі.

— Гадоўляй авечак я займаюся ад 1975 года. Гэты занятак патрабуе многа працы і ўмеласцей. Раней даваў ён вялікі даход. У мінулым, калі я гадаваў і па 200 авечак, прадаваў іх мяса. Шкуры вазіў выпраўляць у Новы Тарг і там шыў з іх кажухі, якія пасля прадаваў. Пазней мінула мода на кажухі і зараз цяжка было б іх прадаць. Гадаваў я таксама свіней. Цяпер засталіся толькі 3 штукі. Цана на свініну вельмі нестабільная і цяжка запланаваць прыбытак ад яе продажу. Яшчэ нядаўна плацілі па 3-3,5 злотых за кілаграм свініны, а зараз можна атрымаць ужо толькі па 2,8-3 злоты, — тлумачыць спадар Астапчук.

Юрый Астапчук раней працаваў у сельскай гаспадарцы ў Швейцарыі. Спачатку хацеў выкарыстаць свой вопыт дома. Аднак ва ўмовах польскай гаспадаркі цяжка было рашыцца на вялікія інвестыцыі.

— Я параіў сыну стрымацца з інвестыцыямі ў гадоўлю кароў. Каб прадукцыя малака была рэнтабельнай, трэба было б трымаць 30-40 штук быдла. Еўрасаюзныя патрабаванні ў адносінах да гадоўлі кароў вялікія і таму трэба было б выдаткаваць многа грошай, каб прыстасаваць нашы аборы да гэтай прадукцыі. Былі ў нас 3 каровы і прадалі іх. Ёсць ужо вопыт у прадукцыі збожжа і таму я рашыўся ісці ў напрамку раслліннай прадукцыі, — кажа Аляксандр Астапчук. — У 2004 годзе дакупіў я ў Агенцтве пераўтварэнняў і мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі 26 гектараў зямлі. Павялічваючы арэал гаспадаркі, купляў штораз большыя трактары і сельскагаспадарчыя машыны. Зараз у Аляксандра Астапчука ажно 4 трактары.

— У нашай гміне няма ўжо вёскі, у якой не было б водаправода. Ёсць ужо каналізацыя ў Махнатым, Старым Беразове, Новым Беразове і Дубічах-Асочных. У гэтым годзе распачнецца пракладка каналізацыі ў Ліпінах, Дубінах і калі паспеем — у Навасадах. У галоўным, сродкі на інвестыцыі — вонкавыя. Гаспадары будуць плаціць за падключэнне да каналізацыі па 1 500 злотых. У гэтым годзе закончыцца асфальтаванне дарогі з Чыжык у Новае Беразова. Будзе таксама пакладзены асфальт на каля 3 кіламетрах дарог на бакавых вулічках Дубін. На працягу апошніх гадоў быў праведзены рамонт школы ў Новым Корніне і рамантаваліся вясковыя клубы. Апошнім часам у нашай гміне рэалізаваных было больш інвестыцый, чым пры Народнай Польшчы, — інфармуе гмінны радны Аляксандр Астапчук.

Яшчэ год назад у Новым Корніне былі аблагі. Зараз абрабляюцца ўжо ўсе палеткі.

— Можа даплаты да расллінай прадукцыі мабілізавалі жыхароў гарадоў, на якіх перапісана частка зямлі ў нашай вёсцы. У Новым Корніне ёсць каля 10 малодшых гаспадароў, якія інвестуюць у свае гаспадаркі. Ёсць гаспадар, які гадуе больш за 100 свіней. У іншага — пад 30 штук быдла. Землі ў нас добрай якасці. Зараз мы хадайнічаем за дрэнажаванне палёў, але інвестарам не будуць тут ужо гмінныя ўлады. Дрэнажаванне палёў затрымалася ў суседніх вёсках. Калі вясной мокра, мы доўга не можам распачаць палявых работ, а позняя пасевы паніжаюць плён. У гэтым годзе добраахвотная пажарная каманда ў Новым Корніне атрымае адрамантаваную пажарную машыну, якая падменіць 27-гадовую, — гаворыць спадар Аляксандр Астапчук, які з'яўляецца старшынёй вясковай пажарнай каманды.

**Аляксей Мароз**



Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

*У аборы Вера і Аляксандр Астапчукі гадуюць 120 авечак*

# Нахабнасць

*„Ніва" ад 3 красавіка 2005 года змясціла „Odpowiedź na oświadczenie" старшыні ГП БГКТ Яна Сычэўскага, накіраваную ў адрас Польскага радыё ў Беластоку. Як заўсёды, спадар Сычэўскі вельмі прынцыпова дамагаецца ад улад Радыё, каб інфармацыя пра арганізаваныя Таварыствам мерапрыемствы была больш змястоўная. Не толькі ён гэтага дамагаецца, але і асяроддзе. Хай сабе будзе так як піша ў сваёй „Odpowiedzi" спадар Сычэўскі. Мне тут разабраць няма як, проста не слухаю Радыё Беласток, бо беластоцкія радыёхвалі да Сопата не далятаюць.*

*Зацікавіў мяне затое іншы ўрывак згаданай „Odpowiedzi": „Szkoda, że nie podał (red. J. Iwaniuk — M. K.), ile razy ukazały się na antenie (zwykle jednozdaniowe) informacje o imprezach festiwalowych. Szkoda, że nie podał ile czasu poświęcono tej problematyce, ile piosenek usłyszeliśmy w wykonaniu naszych zespołów, a ile w wykonaniu bardów z Białorusi — piosenek o treści politycznej, obrażającej częstokroć godność Białorusinów". Адзін такі сказ поўнасцю характарызуе старшыню ГП БГКТ. Выступае ён тут так, як калісь паводзілі сябе сакратары партыі. Мала таго што прынцыпова, але і нахабна. Спадар Сычэўскі быццам не заўважае, што час сакратароў і іх нахабнасці даўно ўжо мінуў, што цяпер журналісты карыстаюцца поўнай свабодай. Спадар Сычэўскі не заўважае, што тут Польшча, не лукашэнкаўская Беларусь, дзе журналісты пішуць і гавораць тое, што загадае ўлада, або сядзяць у турме, калі робяць інакш. Пытаю тады спадара Сычэўскага, дзе маюць спяваць барды з Беларусі, калі дыктатар забараняе спяваць ім у сябе, на сваёй айчыннай мове. Пэўна, спявалі б барды пра каханне і любоў, але што зробіш, калі сітуацыя прымушае спяваць пра палітыку. І яшчэ адно пытанне: ці спадар Сычэўскі з'яўляецца прадстаўніком Лукашэнкі ў Польшчы, калі так дбае каб грамадзяне Беларусі не займаліся палітыкай? І чым жа для спадара Сычэўскага з'яўляецца „godność Białorusina", калі ён не можа займацца палітыкай? Мае быць толькі „панам сахі і касы"?*

*Яшчэ не так даўно думаў я пра кааліцыю ўсіх беларускіх арганізацый у падтрымку прынамсі аднаго кандыдата ў Сейм Польшчы. Але гэта пэўна толькі мая непрыстойная, як відаць, мара.*

**Міхась Куптэль**

# Увага, ашуканцы

Чаго ж гэта не прыдумаюць прайдзісветы дзеля таго, каб ашукаць чалавека. Вось прыклад. 13 красавіка я атрымаў дзіўны тэлефон. Ананімны голас аўтаадказчыка паведамляў, што мне пашанцавала і я выйграў... паўтары тысячы зл. За гэтыя грошы магу пакарыстацца курортам у Мранговe на Мазурах або ў Закапаным. Дастаткова пазваніць у Варшаву па ўказанаму нумару і заявіць, куды хачу паехаць. „Выбар ад цябе залежыць", — завяршыў размову аўтаадказчык.

Я палічыў гэта звычайным махлярствам і нават не запісаў нумара тэлефона. А шкада. Зараз ведаў бы, хто скрываецца за гэтым „дабрадзейным дзядзечкам", які рэкамендуе мне дарэмны курорт. Як пазней выявілася, падобныя званкі былі да іншых жыхароў Чаромхі. Цікава, ці хтосьці забіўся на рэкамендаваны „цудоўны выйгрыш"?

**Уладзімір Сідарук**

**Аб'явы**

Dymka, producent, tel. (022) 785 22 53.

Зорка для дзяцей і моладзі



Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

# Пасля школы...

Гімназісты з Нараўкі напісалі, як праводзяць свабодны час. Вось некаторыя выказванні.

**Роберт Раманчук:** У вольны час я часта гуляю на камп'ютэры, але люблю таксама пабегаць за мячом. Часам з братам гуляем у шахматы. У мяне ў хаце многа кніг і таму я заўсёды знайду нешта пачытаць. Час ад часу еду з бацькам на рыбалку, а калі добрае надвор'е — езджу на ровары або гуляю з сабакам. Амаль кожны дзень сустракаюся з сябрамі.

**Паўліна Трусевіч:** Большасць майго часу паглынае школа і навука, але заўсёды знойдзецца крыху свабоднага часу прачытаць цікавую кніжку або паслухаць музыку. Мае любімыя жанры гэта фантастычныя і бытавыя раманы. У вольны час я з ахвотай слухаю музыку: рок, рэп і папулярную. Амаль кожны дзень я выходжу на панадворак і гуляю з маімі сабакамі — Брокам і Фродам. Рэшту вольнага часу я праводжу з маёй сям'ёй.

**Ася Лапінская:** Я вучуся ў трэцім класе гімназіі. Неўзабаве буду пісаць экзамен і няма ў мяне шмат вольнага часу. А калі штосьці і знойдзецца, то стараюся яго добра выкарыстаць. Калі добрае надвор'е, бяру ровар і наладжваю сабе малую экскурсію або іду ў лес на шпацыр. Найчасцей я сустракаюся з сяброўкамі і размаўляем аб розных справах, у нас тады заўсёды весела. Калі ідзе дождж, чытаю маладзёжныя газеты або цікавую кніжку. Як большасць людзей, люблю вечарам паглядзець добры фільм.



Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

*Гімназісты з настаўніцай Ганнай Кандрацюк*

**Наталля Раманчук:** Вольны час я праводжу па-рознаму. Часта мяне прыцягвае камп'ютэр, шахматы або добрая музыка. Я таксама з ахвотай малюю або чытаю дэтэктыўныя раманы. У цёплыя веснавыя дні я часта выходжу на панадворак. Мабільны тэлефон гэта таксама адзін са спосабаў на тое, як праводзіць свабодны час.

**Бартак Дзеніс:** Калі я прыходжу са школы, тады найбольш люблю пагуляць з братам у футбол, паляжаць і паслухаць музыку або паглядзець тэлебачанне. Кожны дзень я іграю на акардэоне, бо ў будучыні хачу стаць музыкантам. Мяне вучыць найлепшы на Гайнаўшчыне настаўнік. Я думаю, што праз нейкі час у мяне будзе нават свая капэла. Апрача гэтага я кожны дзень дапамагаю бацькам, бо ў нас ёсць невялікая гаспадарка. Калі матуля з бацькам закончаць сваю працу, я пачынаю прыбіраць на панадворку, бо лепш сябе адчуваем, калі нідзе няма смецця.

Калі на двары цёпла, я люблю пакалупацца ў матацыкле. Часам мы нават ладзім гонкі на ім. У мяне няма дня, каб я сумаваў, бо ж ёсць столькі розных гульняў, абы толькі былі сябры!

**Марцін Кандрацюк:** Кожнага дня, калі я вяртаюся са школы, у мяне вельмі многа свабоднага часу. Пасля абеду я рыхтую ўрокі. Займае мне гэта збольшага дзве гадзіны. Пасля гуляю на камп'ютэры або гляджу тэлебачанне. З камп'ютэрам я не займаюся больш за дзве гадзіны, бо баліць мне потым галава. Я вельмі люблю глядзець прыродазнаўчыя перадачы або пра тэхніку. Для мяне яны маглі б быць на кожным тэлеканале.

# Пасхальная гісторыя

Калісьці жыла сабе багатая сям'я, у якой быў цяжка хворы хлопчык. Хлопчык не мог уставаць з пасцелі. Бацькі моцна перажывалі калецтва сына і не шкадавалі грошай на лекараў, каб толькі іх сын выздаравеў. Але ўсё дарэмна...

Надышоў Вялікі пост, дні сталі даўжэйшыя, прыгравала веснавое сонейка. У мясцовасці, дзе жыла гэтая сям'я, улады аб'явілі трывогу — з вязніцы ўцёк небяспечны бандыт ды злодзей, які на сваім сумленні меў ужо смерць многіх бязвінных людзей. Як яго толькі не лавілі! Але з усіх пасткаў ён выходзіў някранутым.

Набліжалася Пасха. Усе жыхары адчувалі ўжо яе настрой. Сэрцы людзей напаўняла радасць, што іх Збаўца ўваскрос.

У пасхальную ноч бацькі хворага пайшлі на ўсяночную службу памаліцца, а хлопчык застаўся ў хаце адзін. Недзе апоўначы рыпнулі дзверы і ў пакой увайшоў мужчына. Хлопчык прыкмеціў, што ў яго была доўгая чорная барада, падзёртая вопратка і страшны ды суровы воблік, але хворы не спалохаўся. Калі мужчына падышоў да ложка, хлопчык выцягнуў да яго руку з пасхальным яйкам, паглядзеў радасна на яго і сказаў: „Хрыстос уваскрос!” Мужчына быў такі здзіўлены, што спачатку не змог сказаць ні слова. Пасля апрытомнеў, спытаў хлопца, дзе ягоныя бацькі, узяў пасхальнае яйка і пайшоў...



Мал. СВЯТЛАНЫ ГАНЧАРОВАЙ

Калі вярнуліся бацькі, убачылі расчыненыя дзверы хаты і занепакоеныя падышлі да сына. Хлопчык расказаў ім пра сустрэчу з незнаёмым чалавекам. Бацькі дадумаліся, што гэта быў той злачынца, якога шукалі ўлады. Але знайсці яго ўжо не ўдалося.

Наступнага дня ў хату хворага хлопчыка прыйшла пасылка. У ёй было лякарства хвораму і доўгае пісьмо. Пісьмо напісаў злачынца, які ў гэтую пасхальную ноч перамяніўся, у яго чорнай ад грахоў душы прасвятлела праўда Хрыстовага ўваскрэсення. Ён дзякаваў хлопцу, прызнаўся ў сваіх злачынствах і сам падаўся ў вязніцу, дзе ўсім расказваў збаўчую вестку, што „Хрыстос уваскрос!”

А хворы хлопчык нечакана выздаравеў...

*Анна Садоўская*

Міра Лукша

## Вялікдзень

*Хрыстос уваскрос!*
*І ўся прырода спявае.*
*Змяніў Ён наш лёс,*
*Адам, які здрадзіў у Раі,*
*Сябе ў жэртву прынёс,*
*Крывёю Сваёй*
*Усе грахі адпускае.*
*Як Чалавек*
*Раны спазнаў і трывогу,*
*Стаўся навек*
*Заступнікам, Збаўцам і Богам,*
*Разам з Айцом*
*Свяшчэнства і Суд Ён здзяйсняе,*
*У Царстві Божым,*
*І Новай Зямлі мы чакаем.*

## Вершы Віктара Шведа

### Хуткая дапамога

*— Я чуў, што ты закончыў*
*Курс хуткай дапамогі.*
*Цяпер ты абаронца,*
*Людзям паможаш многа.*

*Ў патрэбе нечаканай*
*Паможаш ты з ахвотай?*
*Тады прашу, каханы,*
*Пазыч мне сотню злотых.*



Эля Зайко з Беластока

### Канфрантацыя

*У школу заклікаюць*
*Раптоўна бацьку Лёўкі.*
*Сыночак дакучае*
*У школе ўсім сяброўкам.*

*— Чаму крычыш пагана:*
*Дурныя ўсе дзяўчаты!*
*Ты ў тым перакананы?*
*— Сказаў аб тым мне тата.*

# Таемныя песні



Калектыў „Калінка" з Залук

(Паводле запісаў Зыгмунта Глогера ад 1868 года.)

У наваколлі Бельска, паміж Вялікаднем і святым Юрем, кожны вечар сустракаліся дзяўчаты, нават у вялікі дождж, ды спявалі песні. У некаторых вёсках такія вечары называлі „святымі". Абрад гэты старажытнага паходжання, таму што большасць песень мела свецкі характар, яны цесна звязаны з абрадам і азначаным часам. Хоць старажытныя матывы песень часта былі ўжо незразумелыя спявачкам, яны заўзята іх паўтаралі ды не стараліся тлумачыць сэнс... Часам спявалі пад крыжамі за вёскай — тады свае спевы пачыналі з рэлігійнай песні, пасля вярталіся да народных. Звычайна выходзілі за вёску, у ціхае, бязлюднае месца, дзе іх спевы набывалі яшчэ больш таемную і асабістую афарбоўку.

Абрад спеваў пад крыжамі — мяркуе этнограф — можа мецьнейкую сувязь з трызнай — старaславянскім хаўтурным абрадам. Рэліктам гэтага абраду з'яўляецца паслявелікодная Радаўніца, у час якой жывыя галасяць і спяваюць песні памерлым продкам, а таксама спажываюць на могільніку рытуальны пачастунак з велікоднай свянцонай ядой.

Таму спевы пад крыжамі невыпадковыя. Часта ў гэтых месцах, дзе зараз стаяць старыя крыжы, былі вясковыя могілкі.

* * *

У прыпушчанскім Арэшкаве такія песні называюць *огулькамі*. Іх тэматыка ў асноўным — прызыў жыцця! Канкрэтна — заклік кахання ды замуства. Песні насычаны прыродай. У кожнай агульцы дыхае родны краявід, шумяць пушчанскія дрэвы, бурліць рачулка... Поўна ў іх хатняй жывёлы ды экзатычных птушак. Дзяўчына і хлопец параўноўваюцца да самых прыгожых з'яў, яна — да сонейка, ён — да месяца!

**Зорка**

## Польска-беларуская крыжаванка № 18

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 14: Вы, вясковец, вясна, курнік, тон, сшытак, клад, рукзак, рады, дык, скрай. Во, ярд, вус, вяршок, ясны, снітка, скакалка, карк, сват, дар, Ада, сцэнарый.

Узнагароды — запісныя кніжкі — выйгралі: **Кася Бялькевіч** з Беластока, **Андрэй Шарэйка, Эля Анджаеўская, Рафал Тамашук, Марта Зінчук** і **Паўліна Мацяюк** з Дубін, **Юліта Кананюк** з Нарвы, **Дарак Шусцік, Іаанна Леанеўская** і **Юстына Смольская** з Нараўкі. Віншуем!




# Сарока-белабока

Адна з першых птушак, якую заўважаць малечы — крыклівая стракатая сарока. Сама яна нарвецца на вока. Часта трымаецца сяліб. Селіцца ў лісцевым драбналессі сярод палёў і балот, у гаях, парках, уздоўж дарог паблізу ўзлесся. У вялікіх гарадах убачыш яе радзей — крыклівая сарока шуму не любіць, пазбягае і вялікіх глухіх лясоў. Жыве з мужам у вернай пары, хоць вандруе невялікімі чародамі. Вельмі асцярожная і кемлівая птушка. Узятая з гнязда, лёгка прыручаецца.

Не вельмі любяць гэтага прыгожага птаха вяскоўцы. Хоць, як і кожная іншая птушка, сарока вельмі ўпрыгожвае наш краявід, але вось яна ахвотна пачастуецца куранятамі! І курыные яйка з прыемнасцю вып'е праз дзірачку. Корміцца і іншымі яйкамі, хапае птушанят дробных птушак, ловіць грызуноў, у смак ёй харчовыя адкіды, таму і трымаецца блізка вёскі. Гняздо размяшчае ў густых галінах куста ці дрэва, часцей на вышыні ад паўтара да трох метраў. Будуе яго сарочая пара з сукоў, сцяблоў ды карэння травы, унутры замацоўвае глінай і гряззю, вымошчвае поўсцю, зверху і з бакоў накрывае „дахам" (гняздзейка вельмі спраўнае і выгаднае — карыстаюцца ім часам вавёркі і совы). Самка складвае яйкі — блакітна-зеленаватыя з буравматымі плямкамі (да 8 штук) — з сярэдзіны красавіка ды сама іх выседжвае, сарачаняты вылупліваюцца праз 17-18 сутак. У першыя дні пасля з'яўлення малых корміць іх толькі бацька. Праз 22-27 сутак лётныя птушаняты спачатку трымаюцца ўсім выводкам.

У сарочыным гняздзе можна натрапіць на сюрпрыз! Гэтая чорна-белая прыгажуня-стракатуха не можа абысціся без упрыгожанняў! Убачыўшы нейкую прыцягальную бліскаўку, траціць увагу ды абавязкова робіцца мо не зладзейкай, а клептаманкай: абавязкова тое цуда ўхопіць у сваю дзюбу! Вядома, валачэ яго ў гняздо, а можа і згубіць у палёце, зацікаўленая іншым прыцягальным аб'ектам. Заляцеўшы праз адкрытае акно ў нашу хату, сарока ўкрала калісьці стары дзедаў гадзіннік. Я страціла так сваю першую аўтаручку, што давяло мяне да вялікіх слёз (раней пісала я пяром абмакваным у атрамант). У сарочыных гнёздах апыналіся і простыя лыжачкі ды відэльчыкі, а і дарагія ювелірныя вырабы, вартыя палацаў! І нягледзячы на свае норавы, з-за прыгажосці гэтая птушка стала гераіняй шмат якіх карцін, асабліва кітайскіх і японскіх — вырысоўваных тушшу, гафтаваных. Гераіня яна і казачная, і з гульняў яе ведаем. Памятаеце, як матуля-сарока кашку дзеткам варыла, і справядліва па лыжачцы дзяліла паміж тымі, хто ёй пасабляў: „Таму дала, таму дала?.."

Міра Лукша

# Нервы і радасць матурыстаў

*У Гайнаўскім белліцэі 114 выпускнікоў закончыла вучобу, а ў Бельскім белліцэі — 154. Усе яны прыступілі да матуральных экзаменаў. З іх ліку 9 ліцэістаў з Гайнаўшчыны і 3 з Бельшчыны з'яўляюцца лаўрэатамі і фіналістамі Алімпіяды беларускай мовы і яны звольнены з экзаменаў па беларускай мове. Усе гайнаўскія і бельскія белліцэісты, якія ў першыя дні прыступалі да вусных матуральных экзаменаў, справіліся з імі паспяхова...*



Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА



*Перад экзаменамі на тварах вучняў можна было заўважыць перажыванні; пасля выступлення перад камісіяй вучні супакойваліся, многія радаваліся*

Моцна перажывалі сёлетнія выпускнікі Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы перад вуснымі матуральнымі (нельга карыстацца названнем на атэстат сталасці — бо такога названня з гэтага года няма) экзаменамі паводле новых прынцыпаў, якія распачаліся 18 красавіка. Супакойваліся пасля выступленняў перад камісіямі, якія ў першы дзень правяралі веды і ўмеласці па беларускай, польскай і рускай мовах.

— Калі я ўвайшоў перад камісію, у маёй галаве было многа думак. Аднак упэўніў я сябе, што вучыўся і ўсё мусіць быць добра. Было яшчэ хваляванне, але пасля з Божай дапамогай пачаў супакойвацца. У час выказвання было так, што я забываў тое, што раней падрыхтаваў, але ўспамінаў і гаварыў далей, — пачаў расказ Павел Шумарскі. — Для прэзентацыі выбраў я тэму пра маю Малую айчыну — Гайнаўку. Я тут нарадзіўся, вучыўся і тут застануцца мае карані. Для мяне няма нідзе такіх добрых людзей і такога чыстага паветра, як у маёй Малой айчыне. Гаварыў я пра родную беларускую мову, культуру, расказваў пра бацькоўскі дом. Мая беларускасць выводзіцца менавіта з дому, дзе захавалася беларуская традыцыя. У свойскай атмасферы ліцэя была магчымасць сутыкацца з беларускай культурай. Слухаў я тут беларускія песні, хадзіў на беларускія мерапрыемствы. Я хацеў бы ў сваім жыцці ўзмацняць сваю беларускасць.

У гэтым годзе ліцэістам трэба было падрыхтавацца да выступленняў на раней выбраныя тэмы па беларускай і польскай мовах. Яшчэ ў час вучобы вучні саставілі планы сваіх выступленняў. Некаторыя ліцэісты прадбачылі, што будуць карыстацца мультымедыяльнай тэхнікай, іншыя прыносілі вялікія плакаты. Аднак найважнейшая была вусная прэзентацыя, з якой трэба было справіцца на працягу 15 хвілін. Пасля члены камісіі ставілі пытанні, каб дакладней ацаніць выступленні вучняў.

— Покі я прыйшла перад камісію, вельмі нервавалася, ажно ў роце засохла. Пасля пачала супакойвацца. Зараз я думаю, што прэзентацыя па беларускай мове з'яўляецца лягчэйшым экзаменам ад таго, які быў у мінулым годзе. Хаця трэба было хадзіць у бібліятэкі і шукаць інфармацыю, то вядомая была дзялянка ведаў, якія трэба было засвоіць. У мінулых гадах трэба было рыхтавацца да вуснага экзамену па ўсім пройдзеным матэрыяле. Аднак новыя пісьмовыя экзамены могуць быць цяжэйшымі за мінулагоднія. Напэўна рэзультат будзе залежаць ад падрыхтоўкі, але ў нас будзе менш часу, каб напісаць творчую работу, — заяўляе Дамініка Тапалянская.

Павел Шумарскі дабаўляе, што 2,5 года вучобы ў ліцэі мала, каб салідна падрыхтавацца да матуральных экзаменаў. Вучні з сентыментам успамінаюць школу. Звяртаюць увагу на непаўторную атмасферу.

Барбара Петручук раней выступала перад камісіяй, але чакае з сябрамі вынікаў. Пасля выступлення вучня настаўнікі застаюцца ў класным кабінеце самі і хутка вырашаюць, колькі балаў прыдзяліць за выступленне. Абвяшчэнне вынікаў матуральных экзаменаў адбываецца пасля выступлення ўсіх ліцэістаў.

— Я люблю геаграфію, люблю падарожнічаць і таму выбрала тэму „Падарожжа па карце Беларусі". Была я ў Гродне, Мінску і Міры. Найбольш спадабаўся мне замак у Міры, а экскурсавод вельмі цікава расказваў аб ім. Свае назіранні выкарыстала я ў прэзентацыі. У час выступлення карысталася я мультымедыяльнымі сродкамі і паказвала фатаграфіі беларускіх гарадоў. Асаблівую ўвагу звяртала я на розныя напрамкі ў архітэктуры. У Мінску паказала раку Свіслач і паркавыя комплексы. Многа ўвагі адвяла я прыродзе, — гаворыць Барбара Петручук.

Марцін Засім, які з Басяй часта вёў беларускія школьныя і гарадскія мерапрыемствы, выходзіць з экзамену задаволены.

— Старшыня камісіі заявіў, што закончыў я сваё выступленне дзве секунды перад часам. Дапамог мне ў гэтым званок на ўрок, які крыху раней абвясціў час, — кажа Марцін Засім.— Гаварыў я аб наватарстве ў творчасці Васіля Быкава і расказваў аб пераменах у беларускай вёсцы трыццатых гадоў. Рашыўся я ўзяць гэтую тэму, бо рыхтаваўся да Алімпіяды беларускай мовы, прысвечанай Васілю Быкаву і яго творчасці.

Вучні, што выступалі перад рознымі камісіямі, сустракаюцца супольна і абмяркоўваюць козыры і недахопы сваіх прэзентацый. Моніка Кердалевіч, якая распачала экзамены з польскай мовы, кажа, што спяшалася, каб закончыць выступленне перад часам і таму не паспела сказаць усяго, што запланавала. Дзяўчаты і хлопцы, што здавалі экзамены па рускай мове, пасля адказаў вяртаюцца задаволенымі. Гавораць, што трэба было расказаць аб правядзенні вольнага часу, росце злачыннасці, наркаманіі, гарадскім транспарце, прыродзе і апісваць прэзентаваныя фатаграфіі. Апошнім часам у Гайнаўцы хутка расце лік вучняў, якія вучацца рускай мове, а падае колькасць навучэнцаў нямецкай мовы.

Каміль Лукашук і Паўліна Купцэль чакаюць экзаменаў па польскай мове і хвалююцца. Каміль будзе карыстацца мультымедыяльнай тэхнікай. Паўліна рашылася гаварыць аб беларускіх гаворках Падляшша, якія будзе прэзентаваць з дапамогай дыктафона.

— Нават розняцца гаворкі маіх бацькоў, якія выводзяцца з Новага Корніна і Барысаўкі. У вёсцы маёй мамы — Барысаўцы ўжо паяўляецца цеканне, — заўважае Паўліна.

У пачатку матуральных экзаменаў вучні яшчэ неахвотна адкрываюць свае планы на будучыню. Аднак вядома ўжо, што многія хлопцы будуць паступаць у політэхнічныя інстытуты. Дзяўчаты хочуць вучыцца на эканамічных і філалагічных напрамках.

Дырэктар Яўген Сачко задаволены, што экзамены праходзяць згодна з планам. Аднак дае крытычную ацэнку скарочанаму навучанню.

— Не ведаю, ці патрэбныя вусныя матуральныя экзамены па польскай і беларускай мовах. Настаўнікі добра ведаюць сваіх вучняў, іх веды і ўмеласці. Большасць вышэйшых установаў не будзе ўвогуле звяртаць увагу на вынікі вусных экзаменаў. Вучні будуць прымацца ў студэнты паводле вынікаў пісьмовых экзаменаў, якія больш аб'ектыўныя, калі глянуць у маштабе ўсёй краіны. Калі б не было вусных экзаменаў, матура магла б пачынацца з 15 мая. Ліцэісты маглі б цэлы красавік вучыцца і лепш падрыхтавацца да пісьмовых экзаменаў. Зараз экзамены скончацца ў маі і з чэрвеня да канца верасня вучні, якія не будуць здаваць дадатковых экзаменаў на вышэйшых навучальных установах, будуць мець вольны час. Можа варта было б таксама скараціць час працы акруговых камісій у карысць даўжэйшай вучобы ў школе. Настаўнікі маглі б тады больш дакладна паўтарыць і замацаваць пройдзены матэрыял, — кажа дырэктар Яўген Сачко.

У час вусных экзаменаў на паўтара тыдня ў школе абмежаванае навучанне.

— Найгорш арганізаваць навучанне польскай і беларускай моў, бо па гэтых прадметах толькі па адным настаўніку застаецца для навучання малодшых вучняў. Апошнія настаўнікі працуюць у матуральных камісіях нашай школы, а адзін настаўнік польскай мовы ідзе працаваць у камісію суседняга ліцэя. У нашай школе рашылі мы, што настаўнікі ўсіх прадметаў, якія па розных прычынах спазняюцца з рэалізаваннем праграмы навучання, звяртаюцца да мяне і мы з намеснікам прыдзяляем ім у матуральны перыяд дадатковыя гадзіны навучання іх прадмета. Робім гэта, каб вучні не трацілі прадбачанага на вучобу часу, — дабаўляе дырэктар Яўген Сачко.

**Аляксей Мароз**

# Вялікодныя традыцыі

*Майму бацьку з вясной асацыююцца таксама святочныя пірагі. Першыя з іх — буславыя лапы, пірагі, якіх пяклі на Благавешчанне. Наступныя — вялікодная ўжо пасха. Трэцім пірагом з'яўляецца юр'еўскі каравай, які выпякалі на свята мучаніка Юр'я...*


Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Вялікдзень заўсёды папярэджвае перыяд саракадзённага Вялікага посту, у час якога людзі духоўна рыхтуюцца да свята. Паводле расказаў маёй бабулі з Крывятыч, людзі з яе вёскі на час посту дакладна мылі гаршкі і міскі з тлушчу ды выціралі іх саломай на знак таго, што на перыяд посту выракаюцца мясной і тлустай ежы. Адной з такіх „чыстых” страваў быў гэтак званы „ляк”. У ваду ўкідвалі крыху ільну і мукі. З гэтага атрымоўвалася прохлістка, якую елі з селядцамі і бульбай. Празмернае спажыванне яды таксама не было прынятае. Елі толькі абед і сціплую вячэру. Вечарамі людзі збіраліся па хатах ды спявалі набожныя песні.

У нядзелю перад Вялікаднем — на Вербніцу, упрыгожвалі галінкі вярбы і асвячалі ў царкве. Вербачкі павінны былі быць найпрыгажэйшымі. Найчасцей упрыгожвала іх найстарэйшая жанчына ў хаце, ці яе дачка. Трэба было, каб на вярбе паказаліся маленькія лісточкі. Найчасцей вярбу прыносілі дахаты на некалькі дзён перад Вербніцай і ўстаўлялі яе ў ваду. Гэта гарантавала з'яўленне першых лісточкаў. Святочную вярбу пасля асвячэння прыносілі дахаты. Гаспадар udaraў ёю некалькі разоў кожнага дамачадца. Гэта мела запэўніць ім добрае здароўе на ўвесь год. З вярбой у руцэ гаспадар выганяў першы раз у поле жывёлу. Мела гэта забяспечыць поспех у гадоўлі. Вярба ўваткнутая за ікону ахоўвала хату ад грому ў час буры.

Інакш чым цяпер выглядала таксама пасвячэнне пасхі. Цяпер пераважна нясуць у царкву кавалачак мяса, некалькі яек, пірог і соль. Калісьці кошыкі з пасхай былі вялікія. Змяшчалася ў іх многа яды для ўсёй сям'і — на ўсё свята. У Крывятычах з пасхай асвячалі таксама бульбу, якую потым як першую садзілі на полі. Шкарлупінне ад яек кідалі курам, дзякуючы чаму куры мелі несці многа яек. Велікодныя яйкі фарбавалі ў цыбульніку (адвары з шалупінння цыбулі) на чырвоны колер.

Святам Уваскрэсення Хрыстовага цешыліся ўсе супольна, узаемна сябе віншавалі. Не забывалі таксама ў гэты час аб продках. Ішлі цэлымі сем'ямі на магілы блізкіх і пакідалі на іх яйкі ды крышылі пасху.

У Шасталах, вёсцы дзяцінства бацькоў маёй мамы, на другі дзень Вялікадня па вёсцы хадзілі валачобнікі. Гэта былі групы дзяцей, якія спявалі валачобныя і веснавыя песні. Гэты дзень быў таксама вялікім святам для дзяцей, паколькі ад сваіяны так званае валачобнае, у ліку якога найчасцей былі грошы, ласункі, ды... яйкі.

Вялікдзень быў часам гульняў, радасці і смеху. У гульні з прымяненнем яек можна было гуляць на другі дзень свята. Бацькі страшылі сваіх дзяцей, што калі яны будуць гуляць на першы дзень, тады скура будзе злазіць ім з рук і будуць яны абіваць ногі. Дзеці гулялі ў качанне яек з горкі. Выйгравала яйка, якое пакацілася найдалей. Іншая гульня, у якую да сённяшняга дня люблю гуляць — гэта выбіткі. Да яе патрэбныя найменш дзве асобы — ды яйкі. Мэтай гэтай гульні з'яўляецца выпрабаванне, чыё яйка наймацнейшае.

У Крывятычах ёсць яшчэ адна традыцыя, менавіта перакідванне яек па-над хатай. Яйка закопвалі ў тым месцы, у якім яно ўпала. Паводле гаданняў гэта мела забяспечыць здароўе і спакой жыхарам гэтай хаты.

З Вялікаднем звязаныя таксама Провады, якія адзначаюць тыдзень пасля Пасхі. У гэты дзень людзі ідуць на магілы сваіх продкаў. Пасля дзяўчаты і хлопцы абліваліся вадой, каб запэўніць сабе і іншым шчасце.

Майму бацьку з вясной асацыююцца таксама святочныя пірагі. Першыя з іх — буславыя лапы, пірагі, якіх пяклі на Благавешчанне. Наступныя — успомненая ўжо пасха. Трэцім пірагом з'яўляецца юр'еўскі каравай, які выпякалі на свята мучаніка Юр'я. З гэтым караваем гаспадары, часта з бацькамі, абыходзілі палі. Яны спявалі і крапілі збожжа свянцонай вадой. Каравай клалі ў збожжа. Калі ён хаваўся ў ім, абазначала будучы вялікі ўраджай.

Абрады і звычаі звязаныя з Вялікаднем вельмі багатыя. Шкада, што сёння мала хто аб іх памятае, а свята асацыюецца нам часта толькі з прыбіраннем і ядой. Часта забываем і пра сапраўдную мэту Вялікадня — прывітанне Уваскрэслага Хрыста і надзею на збаўленне і вечнае жыццё.

**Жанэта Роля**

# *Ён быў проста неверагодна добры*

Падзеі апошніх тыдняў у Польшчы не маглі прайсці незаўважанымі беларускімі студэнтамі. Шмат хто з нас прымаў удзел у мерапрыемствах звязаных з развітаннем палякаў, католікаў, з Янам Паўлам ІІ, „іх папам”. Калі пішу гэтыя словы, канклаў абраў ужо новага папу, а жыхары майго дома знялі ўжо белчырвоны сцяг з чорнай стужкай. Але ж тое, што адбывалася ў Польшчы, не дасца так проста забыць. Размаўляю з дзвюма студэнткамі трэцяга курса стаматалогіі ў Беластоку, Аняй і Крысяй, якія вырашылі з'ездзіць на пахаванне Святога Айца ў Ватыкан.



Папа Ян Павел ІІ згуртаваў вакол сябе і Касцёла перад усім маладых людзей. Што ў навучанні папы рымскага гэтак Вас прыцягвала?

Аня: — Гэта так, што ён быў проста неверагодна добры. Усе так кажуць, але ж гэта праўда — ён не баяўся быць з усімі блізка — з маладымі, са старымі, з дзецьмі... Няма такога другога чалавека. На жаль, нам здавалася, што папа будзе вечны. Заўсёды перакладалі мы паломніцтва ў Рым „на пасля”, думалі, што яшчэ паспеем. І не паспелі. А калі была магчымасць паехаць у Рым на яго пахаванне — проста не маглі мы не развітацца з нашым каханым папам!

— Вы ехалі з іншымі людзьмі з Беластока. Хто з вамі паломнічаў?

Крыся: — Апрача святара былі дзве старыя жанчыны, двух сталага ўзросту мужчын... але большасць удзельнікаў складала моладзь.

— Дарога ў Рым вельмі доўгая...

Аня, Крыся: — ... і неспакойная. Інфармацыя, якая даходзіла з Польшчы, была проста катастрафічная. На кожнай мяжы нас страшылі, што Рым закрыты, што машыны стаяць на 150 км да Рыма. Гэта аказалася суцэльнай хлуснёй. Арганізацыя была ідэальная, даехаць было няцяжка. На месцы італьянцы таксама вельмі за нас клапаціліся, ва ўсім дапамагалі. Чуткі, што цэны ў Рыме павысіліся ў некалькі разоў, таксама не спраўдзіліся.

— А як выглядалі ўсе мерапрыемствы з Пляца Святога Пятра?

Аня: — Было прыгожае надвор'е. Увесь час свяціла сонца, і ноч была такая зорная, толькі ў хвіліну, калі труну заносілі ў магілу, пайшоў дождж і спадарожнічаў нам усю дарогу дадому. Нібыта анёлы плакалі...

Крыся: — Мы, дарэчы, бачылі амаль усё, частку, праўда, на тэлебімах. Ты напэўна таксама агледала справаздачы ў тэлебачанні. Дык гэта зусім па-іншаму — глядзець камерны запіс і быць там сапраўды. Калі на гэтым вялізным пляцы ўсе пляскалі ў рукі, або ўсе крычалі „Святы!”, рэха, якое няслося, было незвычайнае. Табе пэўна будзе цікава, што бурныя воплескі атрымалі праваслаўныя духоўныя, якія маліліся ў час пахавання. А потым ужо ўсе — сапраўды ўсе — няважна, мужчына, жанчына, католік ці мусульманін, паляк, італьянец, сірыец — усе-ўсе плакалі як дзеці.

Наконт гэтага „Святы!” — ці думаеце Вы, што Ян Павел ІІ павінен быць беатыфікаваны?

Аня, Крыся: — Вядома! Абавязкова! Ніхто не заслужыў на прызнанне святым так, як ён.

Ужо абраны новы папа, Бенедыкт XVI. Як Вы да яго ставіцеся?

Крыся: — Безумоўна гэта не будзе ўжо „наш” святы айцец. Ян Павел ІІ навучаў нас, каб кахаць ягонага пераемніка таксама моцна, як яго. Але наўрад ці гэта будзе магчыма.

**Гутарыла Зофія Наталля Лемеш**

# *Мандарынкі*

У Лазенках у Варшаве вельмі шмат месцаў, дзе можна праводзіць свабодны час. Адным з іх з'яўляюцца Каралеўскія Лазенкі. Выбраўся я там у красавіку з канкрэтнай мэтай. Хацелася пабачыць мандарынку, усходнеазіяцкі гатунак качкі, які лічаць адным з найпрыгажэйшых ува ўсім свеце. У Лазенках жыве адзіны ў Польшчы статак, які ў натуральных умовах разводзіцца — складаюць яго ўцекачы з нявол. Здзічэлыя групы мандарынак сустракаюцца таксама ў Англіі, Нідэрландах ды паўднёвай Нямеччыне, у парках з рэчкамі і сажалкамі.



Неўзабаве я мог палюбавацца мандарынкамі — сярод самчыкаў пераважалі жоўта-аранжава-чырвоныя колеры, яны рухавыя і шпарка імчалі па паверхні вады. Самкі цалкам шэрыя, без яркіх упрыгожанняў.

Ранняй вясной у Лазенках вельмі прыгожа. Дастойна шпацыруюць тут таксама павы ды чуваць галасы разнастайнага птаства.

**Павал Беламызы**

*Старадаўні гэта інструмент, ніхто не можа сказаць адкуль ён з'явіўся, але гэта не перашкаджае кожнаму народу называць яго сваім нацыянальным інструментам...*

# http://gusli.narod.ru

Чалавецтва на ўсім працягу гісторыі суправаджалі музыка і спевы. Са спевамі і музыкай людзі працавалі, бралі шлюб, калыхалі дзяцей, святкавалі розныя святы і, у рэшце рэшт, пад гукі жалобнага маршу адыходзілі ў лепшы свет.

Старадаўнія інструменты неяк больш пасуюць для стварэння мілагучнай музыкі, чым тыя, якія створаны нядаўна, але з-за пэўных абставін распаўсюджаны па свеце болей. Адной з прычын такога шырокага распаўсюду сінтэзатараў — іх універсальнасць. Яны могуць гучаць амаль на ўсе галасы. Але цалкам перадаць гучанне старадаўніх інструментаў ім не ўдаецца. Таму і да сённяшняга часу ёсць руплівцы, якія не даюць знікнуць музычна-інструментальнай спадчыне, сведчаннем чаму з'яўляецца сайт у Інтэрнэце, змешчаны па адрасе http://gusli.narod.ru.

Назва гэтай старонкі — „Гуслі — традыцыя і сучаснасць". Пад назвай чатыры аднолькавыя подпісы на розных мовах, размешчаныя побач з нацыянальнымі сцягамі — Беларусі, Расіі, Вялікабрытаніі і Польшчы. Нам, зразумела, туды, дзе ўказана „чытаць на беларускай мове" — і мы трапляем на першую старонку сайта, якая называецца „Гісторыя гусляў". Пэўна, гэта адна з найцікавейшых бачын „Гусляў", бо тут можна больш падрабязна пазнаёміцца не толькі з гісторыяй і геаграфіяй распаўсюду гэтага інструмента, але і даведацца пра такія гуслі, аб існаванні якіх наўрад ці большасць з нас падазравала.

Нягледзячы на тое, што некаторыя струнныя музычныя інструменты падобныя паміж сабой, цікаўныя аматары шукаюць пачатак іх адрозненняў у старадаўнім мінулым. Ну а мы, дзякуючы гэтаму, можам даведацца, чым тыя ж самыя звыклыя для нас гуслі адрозніваюцца ад ліры ці гусляў шлемападобных, ці з адкрылкам. Аўтар сайта Алесь Чумакоў не дае адказу на пытанне адкуль і калі ўзніклі гуслі, але прыводзіць шэраг цікавых навуковых здагадак. Вось, аказваецца, які старадаўні гэта інструмент — што нават прыкладна ніхто не можа сказаць адкуль ён з'явіўся. Але гэта не перашкаджае амаль кожнаму народу называць яго сваім нацыянальным інструментам.

Рубрыка „Фотаздымкі" не зусім цікавая. Там усяго толькі дзве фатаграфіі з выявамі двух хлопцаў (магчыма, камусьці добра вядомых), якія ў старажытных строях граюць на гуслях.

Добра, калі праца не толькі падабаецца, але адначасова прыносіць прыбытак. Пэўна з разраду такіх людзей і вышэйзгаданы аўтар сайта, які ёсць і майстрам па вырабу гэтых самых гусляў. Апісанні некаторых ягоных прац, гэта значыць зробленых гусляў і іх фотаздымкі, змешчаны на старонцы „Гуслі на продаж".

Рубрыка „Бібліятэка" дае магчымасць не толькі пазнаёміцца са спісам літаратуры па „гуслезнаўству", але і прачытаць кароткія вытрымкі з паасобных кніг. Такім чынам, праз гэты сайт вядзецца нядрэнная праца па папулярызацыі старадаўняга інструмента. Такія акалічнасці выклікаюць да асобы аўтара яшчэ больш павагі.

Ну і апошняя старонка „Гасцёўня". Жадаючыя выказаць свае думкі пра гуслі, музыку, якая з іх ідзе, а таксама нешта запытацца, „заходзяць" сюды. Трэба адзначыць, што гасцей на сайце, гледзячы на колькасць рэплікаў у „Гасцёўні", не так ужо і мала. Значыць, гуслі цікавыя людзям і ў XXI стагоддзі. І менавіта гэтая выснова прыемна ўражвае пасля наведвання „гусельнага" сайта.

**Уладзімір Лапцэвіч**

*15-ы чэмпіянат краіны яшчэ да пачатку адзначыўся шэрагам асаблівасцей. Вышэйшая ліга, пра скарачэнне якой так доўга спрачаліся, зламаўшы безліч слоўных дзідаў, зменшылася сама сабой...*

# Беларусь, беларусы...



## Урэзаная ліга

Футбольны чэмпіянат у Беларусі ўжо звыкла пачынаецца пазней, чым у суседзяў. Слушнасць гэтага пацвердзілася і сёлетняй вясной, бо палі стадыёнаў пасля зацяжной зімы ледзве паспелі падрыхтавацца да спаборніцтваў. Якасць іх папраўдзе яшчэ кепская, бо на большасці спартовых аб'ектаў Беларусі няма сістэмы штучнага падагрэву.

Пятнаццаты чэмпіянат краіны яшчэ да пачатку адзначыўся шэрагам асаблівасцей. Вышэйшая ліга, пра скарачэнне якой так доўга спрачаліся, зламаўшы безліч слоўных дзідаў, зменшылася сама сабой. Дзве каманды, якія мелі права выступаць у мацнейшым дывізіёне, самі адмовіліся ад такога права. Мінскае „Тарпеда"-СКА, адзін са старажылаў лігі, страціла прыватнае фінансаванне, якім жывілася апошнія гады і па сутнасці сканала ў ранейшым выглядзе. З рэчыцкім „Ведрычам" здарылася яшчэ недарэчней. Клуб, які заваяваў пуцёўку ў вышэйшую лігу летась, папросту не здолеў прайсці ліцэнзаванне і сам папрасіўся назад у ніжэйшую кампанію. А некалі самабытнае „Маладзечна" з першай лігі па сваёй волі падалося ў другую. На жаль, такія сёння эканамічныя рэаліі.

Такім чынам у вышэйшай лізе айчыннага футбола засталося 14 камандаў. Паводле ранжыру яны выстраіліся так: „Дынама" (Мінск), БАТЭ (Барысаў), „Шахцёр" (Салігорск), „Тарпеда" (Жодзіна), „Гомель", „Нёман" (Гродна), „Дынама" (Брэст), „Днепр-Трансмаш" (Магілёў), „Нафтан" (Наваполацк), „Дарыда" (Ждановічы), „Славія" (Мазыр), „Зорка"-БДУ (Мінск), МТЗ РІПА (Мінск), „Лакаматыў" (Мінск). Цікава, што ўдзел ва ўсіх пятнаццаці турнірах бралі толькі мінскія і брэсцкія дынамаўцы, гродзенцы, магілёўцы і салігорцы. Асноўным фаварытам з'яўляецца зараз мінулагодні чэмпіён сталічнае „Дынама", якое трэніруе малады амбітны Юрый Шуканаў. У складзе флагмана сабраныя і сама цікавыя легіянеры — бразілец Эду, балгарын Петар Злацінаў, чэх Давід Зоўбек. Цікавае камплектаванне назіраецца ў Магілёве — у складзе „Дняпра" заяўлены ажно 14 (!) украінцаў. А вось „Шахцёр" і БАТЭ, якія будуць прэтэндаваць на многае, прынцыпова абыходзяцца без заезджых гастарбайтараў. Магчыма ў спрэчку за медалі ўмяшаюцца мінскія „мэтээзшнікі". Каманда, якая ледзь утрымалася ў вышэйшай лізе, у міжсезонне прайшла карэнную рэканструкцыю. МТЗ займеў сталае фінансаванне, дзякуючы ўваходу ў міжнародны канцэрн бізнесоўца Раманава. Галоўным трэнерам клуба стаў вядомы Юрый Пунтус, узмацніўся і склад. Прыкладам, за клуб цяпер будзе выступаць былы гродзенец, галкіпер зборнай Аляксандр Суліма. А іншы брамнік нацыянальнай дружыны Юрый Жаўноў бліскуча выступае цяпер у камандзе расійскай вышэйшай лігі „Маскве" (толькі адзін прапушчаны мяч у пяці гульнях!).

Іншымі калектывамі, здольнымі на сюрпрызы з'яўляюцца брэсцкае „Дынама" і „Нафтан", якія маюць цяпер прыстойныя „абоймы" гульцоў. Зрэшты, кола прэтэндэнтаў на прызавое месца акрэсліцца прыблізна пасля васьмі-дзесяці тураў. А пасля першых паядынкаў на чале табліцы сталі „Дарыда", „Тарпеда", мінскае „Дынама", „Днепр" і „Нёман", якія дамагліся стартавых перамог.

**Уладзімір Хільмановіч**

# *Хто ў прэзідэнты*

*Набліжаюцца прэзідэнцкія выбары. У Беларусі большасць народа разумее, што віноўніцай дэградацыі і выміранця карэннай нацыі Беларусі з'яўляецца існуючая ўлада. З пазіцыі біялагічнага закону (ён з'яўляецца фундаментальным законам і палітыкі) гэта не толькі злачынства супраць карэннай нацыі, але і злачынства супраць усяго людства.*

*І вось на сцэне адзін за адным з'яўляюцца патэнцыяльныя прэтэндэнты на ролю выратавальніка беларускай нацыі. Але не трэба забываць прымаўку: „Добрымі намерамі выслана дарога ў пекла". Любыя дзеянні чалавека без ідэі разбуральныя, і яны не менш разбуральныя, калі ідэя памылковая.*

*Якія ж ідэі прапаноўваюць беларускаму народу прэтэндэнты на выратавальніка Айчыны, на якіх ідэалагічных пазіцыях яны знаходзяцца, якімі навуковымі палажэннямі яны кіруюцца?*

*Спадары прэтэндэнты на выратавальніка Айчыны і тыя, што рыхтуюцца да гэтай ролі. Вы спазніліся больш як на 10 гадоў. Гэтую класіку папулізму лепш за ўсіх разыграў першы прэзідэнт, які ў 1994 годзе абвясціў у сваёй перадвыбарнай праграме існасць свайго кіравання: „Улада народная, а не партыйная". Плады гэтай улады мы пажынаем ужо на працягу звыш 10 гадоў. Беларусь адна з самых багатых краін у свеце і акумулявала ў сябе да распаду СССР вялікую частку яго прамысловага, ваеннага і інтэлектуальнага патэнцыялу. Звыш 10 гадоў мы праядаем і разбазарваем гэтыя багацці, але ж яны не бязмежныя нават для Беларусі. На шчасце, беларускі народ пачынае інтуітыўна адчуваць складваюцца сітуацыю, нягледзячы на тое, што яго палітычную адукацыю, сацыяльную свядомасць усімі даступнымі сродкамі ўлада стараецца трымаць на ўзроўні 90-х гадоў мінулага стагоддзя.*

*Існуючая ўлада добра ведае як знешні, так і ўнутраны стан краіны. Вышэйшая кіруючая палітычная эліта краіны цудоўна разумее, што лозунг дзяржаўнага папулізму „ўлада народная, а не партыйная" выдатна папрацаваў на яе звыш 10 гадоў, але сёння грамадства ўжо поўнасцю разумее яго разбуральную сутнасць. Патрэбны новы віток мімікрыі, каб зберагчы за сабою ўладу. Таму ўлада дабравольна саступіць гэты лозунг рухам тыпу „Воля народа", „Новая Беларусь — Адзінства", іншым такога кшталту рухам і ўсёй разам узятай апазіцыі. На працягу 10 гадоў апазіцыя безвынікова вяла барацьбу супраць дзяржаўнага папулізму папулісцкімі метадамі. Сёння поле адкрытага папулізму цалкам аддаецца ў распараджэнне апазіцыі і на ім апазіцыя становіцца ідэальнай мішэнню для прапагандысцкай машыны ўлады.*

*Сама ж улада пойдзе на выбары прэзідэнта пры падтрымцы моцных „адноўленых" палітычных партый, і аснову гэтых партый складуць чыноўнікі і ўласнікі, якія знаходзяцца пад „крышай улады". Гэта будзе PR-кампанія на новым вітку замацавання ўлады за чыноўнікамі. Улада мае ўсе магчымасці стварыць сваю шматпартыйную сістэму і з гэтых пазіцый ідэалагічна і тэарэтычна паказваць усю безгрунтоўнасць высілкаў апазіцыі і яе кандыдатаў — нарадавольцаў-папулістаў. Не з'яўляецца выпадковым жорсткі наступ улады на ідэалагічна слабыя партыі. Невыпадкова з'явіўся на гарызонце магчымы лідэр магчымай аб'яднанай сацыял-дэмакратычнай партыі. Акрэслена вымалёўваецца карціна шматпартыйнай улады: ліберал-дэмакраты справа, „чэсныя" камуністы злева, аб'яднаныя сацыял-дэмакраты ў цэнтры. Іх ідэалогія ідэнтычна нядаўна агучанай прэзідэнтам дзяржаўнай ідэалогіі. Гэтыя сацыял-дэмакраты будуць мець фінансы, у іх не будзе праблем з Міністэрствам юстыцыі, офісамі, праблем з колькасным складам партыі, з доступам да СМІ. 70-80% сяброў партыі будуць складаць чыноўнікі рознага рангу і палітычна несвядомая інтэлігенцыя. Гэта будзе беларускі варыянт рускага мядзведзя (Адзіная Расія). Краіна ў адно імгненне не можа стаць „самай дэмакратычнай краінай у свеце" і сусветная супольнасць, на вялікі жаль, будзе вітаць мімікрыю палітычнай сістэмы тыраніі як рэалізацыю ў Беларусі палітычнага прынцыпу дэмакратыі.*

*Але мімікрыя рэжыму не мяняе яго сутнасці і гэта „ахілесава пята" існуючай улады. Уладная эліта аб'ектыўна не можа распрацаваць новую прагрэсіўную палітычную ідэю развіцця грамадства. А без гэтай ідэі Беларусь не здолее пераадолець дэградацыю і выміранне народа, дэградацыю і разбурэнне краіны. Таму кіруючую эліту абавязкова чакае крах, але за ўладу яна змагаецца і будзе змагацца бязлітасна.*

***Валерый Арцішэўскі (Беларусь)***

# На смерць Яна Паўла II

*Жыццё незвычайнае. Яшчэ ўчора думаў я напісаць нейкую рэцэнзію ў „Ніву” адной з выдадзеных у апошнім часе кніжак у Беларусі. Сёння ж — пішу вось гэты рэквіем у гонар памерлага 2 красавіка г.г. папы рымскага Яна Паўла II. Можа была б гэта звычайная справа, калі б я быў каталікам, так як шматлікія мае суродзічы беларусы (з малой Бацькаўшчыны кс. Юрыя Папялушкі — Дуброўшчыны ці Сакольшчыны, шмат жа ж і з Беластоцкага наваколля). Але бяру я голас як русін, ахрышчаны ў праваслаўнай царкве, і прытым тутэйшы, бо ж родам з Падляшша. Русін, якому вышэйшай воляю, давялося шмат гадоў працаваць у каталіцкай навуковай установе — Люблінскім каталіцкім універсітэце, а гэта значыць у тым, у якім кіраўніком кафедры этыкі быў у свой час і памерлы Ян Павел II.*

*Я ніколі не сустрэўся з Памерлым, але, у пэўным сэнсе, быў вучнем ягонага блізкага сябра, св. п. праф. д-ра габ. Рышарда Лужнага — заснавальніка славістыкі ў Люблінскім каталіцкім універсітэце, пад кіраўніцтвам якога мне давялося шмат гадоў працаваць у гэтай універсітэцкай установе і які, такім чынам, сыграў немалую ролю і ў маёй біяграфіі.*

*Канешне, маё ўспрыманне каталіцызму, як чалавека з праваслаўнай радаслоўнай, ёсць падобнае да ўсіх праваслаўных. Практычна нічым яно не адрозніваецца. Адных маіх суродзічаў можа аднак здзіўляць, што я ў свой час апынуўся ў гэтай каталіцкай установе. Іншыя — могуць сур’ёзна непакоіцца. Усіх магу запэўніць — нікому і нічаму я не здрадзіў. А працаваў я разам з праф. д-р габ. Аляксандрам Баршчэўскім, калі існавала яшчэ тут беларусістыка. Ад гэтага года ізноў тут працую, але ўжо выкладчыкам расійскай літаратуры XIX ст. Раней выкладаў у ім, між іншым, тэорыю літаратуры, беларускую літаратуру, рускую, украінскую і беларускую мовы.*

*Якраз праф. Лужны быў той асобай, якая неяк непасрэдна спалучала мяне з рымскім папам, ягоным сябрам. І трэба сказаць, што, калі б не асабістае рашэнне а. Яна Паўла II, узнікненне славістыкі ў Люблінскім каталіцкім універсітэце, у якім заўсёды вучылася і вучыцца шмат беларусаў, перш за ўсё з Беларусі, было б немагчымым. Раней у гэтай навуковай установе, хоць сваімі пачаткамі сягае яна існаваўшай у свой час Духоўнай акадэміі ў Санкт-Пецярбургу, не было для гэтага спрыяльнай атмасферы. Нялёгка было стварыць і саму славістыку з прычыны недахопу навуковых кадраў. Таму на прапанову св. п. праф. Рышарда Лужнага я без хістання адказаў пазітыўна. Разумеў, што толькі існаванне беларусістыкі ў розных па свайму характару навуковых установах можа вывесці яе на міжнародны еўрапейскі і сусветны шлях, да якога і надалей увесь час яшчэ далёка (на Захадзе, калі не ўлічваць Польшчы, і дагэтуль няма ніводнай беларусістыкі!).*

*Гэта невыпадкова, што амаль разам з узнікненнем беларусістыкі ў Люблінскім каталіцкім універсітэце, узнікла яна і ў Універсітэце Марыі Кюры-Складоўскай. І разам з фактычнай смерцю яе ў 2001 г. перастала яна існаваць і ў гэтым універсітэце. Не стала ў 1998 г. св. п. праф. Рышарда Лужнага, у тры гады пазней не стала і заснаванай Ім жа беларусістыкі ў Люблінскім каталіцкім універсітэце, да якой непасрэднае дачыненне, звязанае з яе ўзнікненнем, меў і Памерлы цяпер Ян Павел II — рымскі папа.*

*Гэта толькі адзін, як вядома, з аспектаў дзейнасці святога для каталікаў айца. Не закрануў я ў гэтай публікацыі і іншых аспектаў Ягонай дзейнасці этычнага характару, які разам са стаўленнем Ягонага сябры, праф. Рышарда Лужнага, з’яўляецца не чужым, як для беларусаў, так і ўкраінцаў у Польшчы.*

*Вечная Табе памяць, Папа-славяніне, па маці — русіне-ўкраінцу — рэвалюцыйнаму персаналісце!*

**д-р Юрый Трачук**
***— выкладчык Падляшскай акадэміі ў Седльцах і Каталіцкага люблінскага універсітэта імя Яна Паўла II***

# Апалітычныя вяскоўцы



Некалькі апошніх гадоў мне давялося пажыць на вёсцы, пабыць рынкавым гандляром, беспрацоўным і чорнарабочым. Я пазнаў жыццё розных катэгорый «простых» людзей, чуў ад іх тое, чаго ніколі яны не скажуць ні карэспандэнту газеты, ні партыйнаму актывісту.

Самымі апалітычнымі лічацца вяскоўцы. Аднак на ўсіх апошніх выбарах і рэферэндумах, па афіцыйных даных, яны найбольш актыўна галасуюць і стопрацэнтна падтрымліваюць існуючую ўладу. Парадаксальна, але так яно і ёсць. Вёска, дзе я жыў, знаходзіцца ў баку ад вялікіх дарог і прамысловых цэнтраў. Як раней казалі — «неперспектыўная». Жывуць у ёй амаль адны старыя. Ёсць некалькі маладых хлопцаў, якім не ўдалося жыццё ў горадзе і яны вярнуліся да бацькоў. Большасць з іх па некалькі разоў сядзела ў турме за дробныя кражы ці бойкі. Адзіны стабільны прыбытак зімой — гэта пенсія старых, летам — гаспадарка і збіранне грыбоў на продаж. На грыбах, дакладней на лісічках, можна нядрэнна зарабіць. Яны добра прадаюцца на Захад, на чым нажываюцца легальныя і нелегальныя арганізацыі, якія праз сваіх прадстаўнікоў скупляюць грыбы ў вяскоўцаў. Але старым з грыбных грошай амаль нічога не застаецца. Трэба дапамагаць дзецям, што ўладкаваліся ў горадзе. Хлопцы свае грошы адразу прапіваюць. Мужыкоў засталося вельмі мала, паміраюць або ад гарэлкі, або ад непасільнай працы. Яшчэ амаль кожны год нехта вешаецца. Бабулькі з горыччу ўспамінаюць пра грошы, якія яны згубілі падчас абмену на новыя, яшчэ ў савецкія часы. А іх у старых панчохах, скрынях, трохлітровых слоіках засталася не адна тысяча ў кожным вясковым доме. Таму, калі Лукашэнка паабяцаў, што верне ўсё страчанае, уся вёска літаральна бягом кінулася за яго галасаваць. Успаміны пра гэта можна пачуць падчас кожнага прыезду «аўталаўкі». Некалькі гадоў назад у вёсцы закрылі краму і зараз два разы на тыдзень з цэнтра сельсавета на машыне прывозяць прадукты. Гэта сапраўднае свята для жыхароў. Ёсць нагода сустрэцца з суседзямі, пагаварыць, у тым ліку і пра палітыку. Адносіны да Лукашэнкі значна змяніліся. Пасля падману са зваротам грошай яму ўжо ніхто не верыць. Але вяскоўцы ўпэўнены, што пенсіі дае ім прэзідэнт. Кошты таксама ён падвышае, таму рэйтынг Лукашэнкі хістаецца ў супрацьлеглыя бакі гледзячы ад таго, што раней павялічыцца: кошты або пенсія. А апошняя ніяк не можа ўгнацца за першым. Чакаць таго, што гэтыя людзі паедуць у Мінск на плошчу Незалежнасці адстойваць свае правы — нявартa. Але, калі б на Беларусі адбыліся сапраўдныя выбары, вяскоўцы наўрад ці галасавалі б так сама як у 1994 годзе. Нагул у беларускіх вёсках жывуць добрыя, шчырыя, добразычлівыя людзі. Што да адчування сябе адзіным цэлым з усім народам краіны, гэтага амаль няма. Наш чалавек ці не наш залежыць ад таго з нашай ён мясцовасці ці не. Размаўляюць людзі на цудоўнай беларускай мове, аднак, як і сто гадоў назад, лічаць яе вясковай, а рускую — гарадской. Думаю, што я для іх стаў сваім менавіта з-за мовы. Яны палічылі мяне «нашым вясковым хлопцам». Хаця ж да гэтага з Гродна больш на тыдзень я ніколі не выязджаў.

Магчыма ў вялікіх вёсках і пасёлках, пра росквіт якіх увесь час кажа беларускае тэлебачанне, сітуацыя іншая. Але большасць вёсак здаецца быць такімі, у якой я жыў.

**Зміцер Кісель (Гродна)**

# Эх, моладзь!

Часта падарожнічаю раннім цягніком, які адпраўляецца з Чаромхі ў Беласток а 6.17. Гэтым поездам дабіраецца амаль семдзесят працэнтаў школьнай моладзі з наваколля Чаромхі, Кляшчэляў, Рыгораўцаў і Падбелля ў бельскія сярэднія школы. Для людзей старэйшага ўзросту гэта не падарожжа, а кашмар. За падросткамі цяжка знайсці сядзячае месца. Ужо ў Чаромсе купэ, якое прызначаецца для чатырох-васьмі асоб, „браніруе” двух-трох падросткаў. Калі б стаяла побач старэйшая асоба, дык не папросяць сесці. А як сябе паводзяць маладыя? Прабачце, даражэнькія, горш за жывёлу — піскі, крыкі, лаянка, безупыннае швэнданне і бразгатанне дзвярыма, а што горшае — атручванне папяросным дымам, бо кураць як хлопцы, так і дзяўчынкі. Неаднойчы прыводзіў я такіх у парадак, а яны пасылалі ў мой бок іранічную ўсмешку, а часам грубае слова.

Не лепш справа маецца пасля абеду, калі вучні вяртаюцца са школы. Пакуль цягнік спыніцца ў бельскіх перонах, смельчакі „штурмуюць” вагоны. Малая няўвага і... выпадак гатовы. А калі малалетак апынецца пад коламі поезда, каго тады будзем вінаваціць? Па-мойму, час скончыць з гэтай анамаліяй. Паводзінамі даяздкаючых у школы дзяцей (не толькі ў бельскія, у гайнаўскія таксама) павінны больш цікавіцца бацькі, настаўнікі і чыгуначныя службы. Наконт гэтых апошніх у мяне шмат заўваг. Многія з функцыянераў службы аховы чыгункі прыплюшчваюць вока на паталагічныя з’явы падросткаў. А так быць не павінна.

**(ус)**

# Амерыканская ліпа

Калісьці, пры камуне, найбольш моднымі ў нас былі савецкія фільмы і яны так мне надаелі як чарвівая рэдзька. Вядома было, што яны былі аснаваны на фальшы і хлусні. Але калі ў Польшчы стала правіць новая ўлада, тады савецкія фільмы былі падменены амерыканскімі. Ці гэтае навоўвядзенне змяніла наш менталітэт і думкі ў лепшым напрамку? Зусім не, бо яны не лепшыя за савецкія і таксама заснаваны на фальшы, абмане, хлусні, парнаграфіі, бандытызме. Для прыкладу возьмем многасерыйны амерыканскі фільм „Мода на поспех” (у Беларусі вядомы пад загалоўкам „Дёрзкие и красивые”), які цягнецца ўжо колькі гадоў і ўсё там адным мірам мазана. І колькі жыву такога дурнога і пазбаўленага сэнсу фільма я яшчэ не бачыў. Там адны пустасловы выступаюць, няма там ніводнага разумнага. Каля крамы ў Дубічах ёсць намнога лепшыя „артысты і акцёры” за тых, што ў згаданым тэлесерыяле. Спачатку я лічыў гэты фільм байкай для дарослых, але ж нават дзеці пазнаюць там штучнасць, мелкасць і фальш. Такі фільм нічога добрага не дасць акрамя псавання нерваў і раскладу думак. Аўтары фільма „слаўныя”, але не ў мяне. Так і многія амерыканскія фільмы, дзе паказваецца насілле, варварства і хлусня, вартыя нуля. Як можна верыць фільму, дзе нейкі амерыканскі разведчык распраўляецца з дзесяткамі савецкіх ці в’етнамскіх падобных сабе праціўнікаў? Не пярэчу, што ёсць і добрыя высакакасныя амерыканскія фільмы, але „Мода на поспех” гэта найгоршае барахло і смецце; так я думаю.

**Мікалай Панфілюк**

**Ніва** ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

**Nakład**: 1 914 egz.
**Выдавец**: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
**Старшыня**: Яўген Вапа.
**Адрас рэдакцыі:** 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
**Тэл./факс:** (+48 85) 743 50 22.
**Internet**: *http://niva.iig.pl/*
**E-mail**: *redakcja@niva.iig.pl*

*Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.*
**Галоўны рэдактар:** Яўген Вапа.
**Намеснік гал. рэдактара:** Віталь Луба.
**Сакратар рэд.:** Аляксандр Максімюк.
**Рэдактар „Зоркі”:** Ганна Кандрацюк-Свярубская.
**Публіцысты:** Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.

**Канцылярыя:** Галіна Рамашка.
**Камп’ютэрны набор:** Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
**Друкарня**: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
**Prenumerata:** 1. Termin wpłat na prenumeratę na III kwartał 2005 r. upływa 5 czerwca 2005 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch” na terenie całego kraju.

2. Cena prenumeraty na III kwartał 2005 r. wynosi 26,00 zł.

3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.

4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,50 zł, a kwartalnie — 45,50 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa”, Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta BPH PBK SA Oddział w Białymstoku 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

# Афарызмы
## Ладзіка Майніча

**Філязофія жыцьця**

Можна кепска бачыць, але добра заўважаць.

*

Праўды ў нагах няма. Але няма яе й вышэй.

*

Чалавечае няшчасьце складаецца зь вялікага гора, шчасьце — з маленькіх радасьцяў.

*

Першая прыступка, у адрозьненьне ад апошняй, заўсёды вядзе ў неба.

*

Сама складанае ў жыцьці — застацца проста чалавекам.

*

Калі ўвесь сьвет пад тваімі нагамі, гэта яшчэ ня значыць, што ты на Небе.

*

Флюгеры вышэй, чым вентылятары, таму што круцяцца ў розныя бакі.

*

Сама жорсткая памылка — быць занадта правільным.

*

Трапіць пры жыцьці ў энцыкляпэдыю — значыць заўчасна адправіцца на могілкі.

*

Праўда — гэта палка з двума канцамі: адзін б'е па табе, другі дабівае.

*

Ад жыцьця хочацца заўсёды больш пасьля сьмерці.

*

Усе хочуць ведаць праўду, але ніхто ня хоча яе гаварыць.

*

Нічога новага ўжо ня скажаш, застаецца па новаму ўбачыць.

*

Адныя не хапаюць зорак зь неба, іншым іх не хапае.

*

Ісьціна нараджаецца, але не жыве ў спрэчках, бо адразу ідзе ў прочкі.

*

Знайшоў падкову на шчасьце — лічы звычайная выпадковасьць.

*

Безьліч людзей любіць мора й толькі адзінкі — акіян.

*

Пустое месца можа сьведчыць пра зьмястоўнасьць таго, хто яго не заняў.

*

Лягчэй паверыць у тое, што адчуваеш, чым у тое, што чуеш.

*

Жыцьцё — гэта гульня. Сёньня ў тваіх руках калода картаў, заўтра твая галава на калодзе эшафоту.

*

Падобна на тое, што ў кнізе лёсаў бываюць выдраныя старонкі.

*

Дабро ўрэшце пераможа. Можа.

*

Там добра, дзе нас ніколі ня будзе.

*

Гэты сьвет недасканалы — ніяк ня можа сканаць.

*

Крылатыя выслоўі любяць гнездавацца ў лысай галаве.

*

Падарункі лёсу ня маюць нічога агульнага з Божым дарам.

*

Матэматыкі — сама вялікія дагматыкі, бо два на два можа быць ня чатыры, а дзьве пары.



Фота ГЛЕБА ЛАБАДЗЕНКІ

# „Даўціпы" Андрэя Гаўрылюка

Гутарыць дзве суседкі:

— Ведаеш, той наш сусед знізу, гэта вельмі добры чалавек! Цэлы набытак свайго жыцця апісаў на сірочы дом.

— А многа гэтага было?

— Васьмёра дзяцей.

***

Усхваляваны Янка прыбягае да суседа:

— Янка, ратуй! Патрэбны мне дзве вядры вады.

— Калі ласка. Але ж у цябе свой калодзеж...

— Гэта праўда, але ў яго ўпала цешча і вада сягае ёй толькі да барады.

***

За столікам у мінскім рэстаране села траіх мужчын.

— Ай! — азываецца адзін.

— Ай-вай, — кажа другі.

— Ну-ну, — адказвае трэці.

— Слухайце, — трывожна шэпча першы, — калі вы не перастанеце гаварыць пра палітыку, тады я выходжу адсюль.

***

У дзверах раздаецца званок:

— Ці гэта вы падавалі ў газету аб'яву, што шукаеце энергічнага апекуна для свайго жулікаватага сынка? — пытае гаспадара плячысты незнаёмец.

— Так. А ці вы лічыце сябе адпаведнай для гэтага асобай? Дзе вы працавалі дагэтуль?

— У цырку: быў дрэсіроўшчыкам тыграў.

***

Янка прыносіць дадому зарплату, кладзе яе перад люстрам і кажа жонцы:

— Гэта што перад люстрам — маё, а тое што ў люстры — тваё!

Жонка распранаецца дагала, стае перад люстрам і адказвае:

— Тое што ў люстры — тваё, а што перад люстрам — суседа з другага паверха!

# Адгаданка-шыфраграма

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 |
| 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | | | | |

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — прыказку.

1. дробнае бяскрылае насякомае, якое паразітуе ў валасяным покрыве чалавека і жывёл = 23 _ 6 _ 8 _;
2. напр. Джамалунгма або Кіліманджара = 5 _ 22 _ 7 _ 9 _;
3. напр. Луўр, Прада, Эрмітаж = 21 _ 20 _ 19 _ 24 _ 10 _;
4. Георгій, нарком замежных спраў СССР у 1918-1930 гг. = 25 _ 26 _ 13 _ 12 _ 11 _ 14 _ 1 _;
5. паглыбленне ў зямлі, упадзіна = 2 _ 3 _ 4 _;
6. раўчак, у які цячэ халодзенькая вада ў папулярнай песні = 15 _ 17 _ 18 _ 16 _; **(ш)**

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

**Адказ на адгаданку з 12 нумара**

Агіда, адрыў, акула, гуд, доля, Ева, лубін, ніва, Ніл, Пуцін.

Рашэнне: **Гулі не аднаго ад навукі адвярнулі ды ў лапці абулі.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока і **Валянціне Марціновіч** з Краснага Сяла.

# 01.05 – 07.05



**Баран (21.03. — 19.04.)** Ілбом муру не разваліш, хоць ты з вялікім імпэтам накідаешся на розныя цяжкія для развязкі справы. Старайся ў гэтыя прыгожыя дні не сутыкацца са Скарпіёнам; магчымыя непаладкі з-за гэтых самых інтарэсаў.

**Бык (20.04. — 20.05.)** Гандлярам не вельмі пойдзе гандаль, настаўнікам — ацэнка вучняў, а вучням цяжка будзе ўседзець на ўроках (добра хоць, што шмат выходных! — гэта таксама прыемна і для іншых прафесій). Праверце свае ныркі.

**Блізняты (21.05. — 21.06.)** Старайся не абдурваць ні кагосьці іншага, ні самога сябе, бо можа вылезці шыла з мяшка. Навукоўцы, настаўнікі і вучні — не марнуйце начэй на штосьці іншае, чым сон. Землярobам: па Юр'і можаце ацаняць надвор'е і магчымыя поспехі ў гаспадарцы ды жыцці. Знакаміты час на аднаўленне красы дзяўчат (ва ўсіх знаках).

**Рак (22.06. — 22.07.)** Рак-мастак набярэ асаблівай творчай моцы, Ракчыноўнік павінен прывітаць з усмешкай усіх наведвальнікаў (асабліва ў тых гмінах, дзе пражывае большасць беларусаў). Рак-вучань, асабліва ліцэіст павінен спакойна наядацца рыб, у якіх шмат фосфару, што ўплывае на розум і памяць.

**Леў (23.07. — 22.08.)** Добры час аднавіць свае сілы, асабліва псіхічныя. Варта ў выхадныя паехаць на прыроду, у вёску. Добры кантакт з дзецьмі — сваімі і чужымі. Ільвам-настаўнікам варта мець у запасе псіхатропы; не ўжывайце іх заранёў, бо, дасць Бог, абыдзецца.

**Дзева (23.08. — 22.09.)** Дзеве-мастачцы можна спадзявацца наезду гасцей, якія па вядомых прычынах не дадуць спакойна займацца творчай працай (а рыхтуецца прыліў натхнення якраз у гэтыя дні!).

**Шалі (23.09. — 22.10.)** Варта вам спрабаваць шчасця ў латарэйных гульнях; калі не будзе выйгрышу, дык і страта невялікая, але выпадала б даць шанц лёсу. У выпадку выйгрышу просім паведаміць рэдакцыю „Ніўкі".

**Скарпіён (23.10. — 21.11.)** У гэты раз твой яд — неядавіты. Незвычайная лагоднасць і ветлівасць, што заўважаць іншыя і могуць гэтым вам адказаць; маленькія прыемнасці.

**Стралец (22.11. — 21.12.)** Можаце змяніць неспадзявана імідж: пафарбаваць чупрыну, калі яна ў вас ёсць, скінуць кілаграмы, калі яны ў вас маюцца. Стральцам з ліцэяў і гімназій: часам варта прытварыцца, што вы трапляеце менш метка чым настаўнік...

**Казярог (22.12. — 19.01.)** Не брыкайце занадта на прыродзе, асабліва калі вы мастак у гадах і былы мастак падчапляць чужых паненак... На вечар выпівайце напар са святаянніку (добры на страўнік і настрой).

**Вадалей (20.01. — 18.02.)** Рабочыя і сяляне будуць цешыцца з нагоды святаў, але іх жанчынам-Вадалеям спуску не будзе: работы больш, а падзяка — у наступным тыдні, і то неабавязкова і не ад кожнага.

**Рыбы (19.02. — 19.03.)** Хто галасу не мае? Рыбы і дзеці, якім не хочацца адказваць на ўроках. Выкажы свае патрэбы, а атрымаеш па заслугах.

Агата Арлянская

ISSN 0546-1960


*Музыкі* ☞ II


# Ніва
## ВЕЛІКОДНАЯ



*Супрасль* ☞ III

# Дарога ў музыканты



**Нарадзіўся я, гаворыць Ярослаў АНТЫПОВІЧ, у 1970 годзе ў Гайнаўцы. Мае бацькі, Уладзімір і Анна Антыповічы, жывуць у вёсцы Кленікі. Ахрысцілі мяне Яраславам па прапанове маёй старэйшай сястры Люцыны.**

**Мае бацькі прыгожа спявалі, а мне, маленькаму хлопчыку, іхнія спевы вельмі падабаліся. Я заўсёды падспеўваў паціху тыя словы, якія мне запамяталіся. З маленства любіў я спяваць, марыў стаць музыкантам, мець свой гармонік. Шасцігадовым хлапчуком пайшоў я калядаваць з думкай назбіраць грошай на інструмент. Бракуючую суму далажыў тата і купіў мне акардэон, які называўся „Малыш”.**

Мець акардэон гэта яшчэ не ўсё, адзначае мой суразмоўца, трэба было яшчэ іграць на ім. У Кленіках былі свае музыканты. Бацька запрасіў у хату аднаго з іх, Янку Кабаца, які паказаў мне як іграць на басах. Басы таксама не ўсё, бо на клавішах нічога не атрымоўвалася. Такім чынам мой „Малыш” больш служыў для забавы, чым для навукі ігры. Было мне вельмі крыўдна. Браў я акардэон, выходзіў на лавачку перад домам і чакаў, што можа праходзячы вуліцай музыкант зацікавіцца мною і дапаможа мне разабрацца ва ўсім гэтым горы. І праверце, кажа Ярослаў, мае мары збыліся. Сапраўды, пры мне затрымоўваліся нашы гарманісты, бралі мой акардэон, ігралі на ім, а я стаяў, слухаў, глядзеў ім на пальцы і захапляўся іх майстэрствам, хаця інструмент больш нагадваў дзіцячую цацку, чым акардэон. Я сам сябе угаварваў, пераконваў, што мушу навучыцца іграць, стаць музыкантам, спеваком, што буду весяліць сваю душу і сваіх блізкіх.

У другім класе падставовай школы мой дзядзька падарыў мне сапраўдны 80-басавы акардэон „Сюіта”. Гэта змабілізавала мяне да навукі ігры на гэтым інструменце. Заўважыўшы маю схільнасць да музыкі, дзядзька забраў мяне з сабою ў Гарадок і паказаў мясцоваму музыканту, якога звалі Бярозкай. Ён заняўся мною. Першай песняй была „Рабіна, рабінушка”. Пад канец канікулаў дзядзька сарганізаваў развітальны вечар з маім настаўнікам, які тады заіграў на акардэоне, а я — на грэбені. Гэты вечар замацаваў у мяне ўпэўненасць у маіх музычных здольнасцях.

Пасля канікул увесь вольны час прысвяціў я дасканаленню ігры на акардэоне. Пад Раждаство падрыхтаваў я калядкі. Жыхары Кленік шчыра віталі нас, калядоўшчыкаў, якія прыгожа спявалі пад мой акампанемент. Аднак мяне асабіста спасцігла бяда, бо ад марозу і снегу мой акардэон рассыпаўся. Не мог я спаць, не мог вучыцца, успамінае Ярослаў Антыповіч. Дапамог мне сябра майго бацькі, Уладзімір Касцючук — псаломшчык у кленіцкай царкве (у прыватнасці, бацька цяперашняга епіскапа Іакава), які наладзіў мой акардэон і запрасіў да сябе на вячоркі. Спадар Уладзімір і ягоны сын Якуб зайгралі разам на баяне і на маім акардэоне. Я іх музыкай быў проста зачараваны. Вярнуўся я ўзрадаваны дахаты, узяў у рукі акардэон і сталася нешта дзіўнае: я пачуў ад іх натхненне, нейкую моц і без клопатаў сумеў перанесці на клавіятуру інструмента ўсё тое, што меў у галаве і сэрцы.

У падставовай школе на ўроках музычнага выхавання атрымліваў я самыя пяцёркі, а настаўніца Марыя Галавачык накіравала мае зацікаўленні ў музычны бок. Рускай мове вучыла нас Марыя Іванюк, а беларускай — Вольга Германюк, якая таксама вяла школьны хор. З шостага класа я таксама спяваў у хоры, а ў сёмым і восьмым — акампанаваў гэтаму хору. Дзякуючы настаўнікам мая ігра на акардэоне ставалася штораз больш дасканалай. Тата, пабачыўшы мае поспехі, купіў мне 120-басавы акардэон „Дэліцыя”.

У сярэднюю школу паступіў я ў Бельск, у Сельскагаспадарчы тэхнікум, дзе працаваў ансамбль песні і танца „Падляшскія зязюлі”. У Бельску чатыры гады наведваў я заняткі ў музычным гуртку. Мой настаўнік музыкі Яўген Сахажэўскі запрапанаваў мне іграць на кантрабасе ў згаданым калектыве, якім кіраваў Мікалай Турковіч. З „Падляшскімі зязюлямі” пабываў я ў Беларусі, Літве, Югаславіі, Турцыі і ў шматлікіх гарадах Польшчы.

У чацвёртым класе тэхнікума мы з Янкам Сабешуком з Пасынак, Янкам Федаруком з Піліпкоў і Яўгенам Іванюком з Кнаразоў заснавалі калектыў „Сэрвус”, у якім іграў я на бас-гітары. Ігралі мы на вечарынах і вяселлях.

У 1990-1992 гадах служыў я ў войску і там навучыўся іграць на клавішных інструментах. Пасля вяртання з арміі купіў я сабе клавішы „Роланд Е-15” і далей іграў разам з Янкам Сабешуком і Яўгенам Іванюком.

1993 год быў для мяне пераломны — ажаніўся я з Малгажатай Фалькоўскай з падбелавежскіх Пагарэльцаў. У нас двух сыноў, якія таксама любяць музыку. Думаю, што будзе каму перадаць інструменты. Сам я многа іграю на акардэоне на розных мерапрыемствах у рэстаранах Белавежы, пры лясных вогнішчах, для пенсіянераў, якім мая музыка напамінае пра маладосць. У маім рэпертуары — беларускія, украінскія, рускія і польскія песні.

За зароблены ў час выступленняў грошы набываю новае музычнае абсталяванне, дзякуючы якому магу абслугоўваць пленэрныя мерапрыемствы. На сённяшні дзень нічога не хачу мяняць у маім жыцці. Тое, што раблю — маё захапленне, якое пачалося з шостага года жыцця. Я нарадзіўся музыкантам і ім памру, — канчае аповед Ярослаў Антыповіч.

**Віктар Бура**



***Уладзімір Саўчук***

## *На Падляшшы*

*Не магу дамовіцца з душою*
*адгукнулася бракам натхнення*
*з гэтых вуснаў, сум загрызае*
*маю долю і лёс пакаленняў*

*усім тым, каму блізкае слова*
*а засеяў „зерне” прымусам*
*не падзеліш на двое душы*
*а пацвердзіш сябе беларусам.*

*„Паласатая” мова жыве*
*заўжды там, дзе жывуць яе дзеці*
*каб маглі і філосафы бачыць*
*як парадак вядзецца ў свеце,*

*сто гадоў баранілася навука*
*а паэтаў за рукі вялі*
*хай цяпер з паласатай правінцыі*
*вырастае соль гэтай зямлі.*

*02.01.2004 г.*

## *Падумайце*

*На загонах пражытых гадоў*
*пахла зелле — рамонак бялявы*
*раней сонцу кланяўся аблог*
*сёння дрэвы шумяць і шумяць,*

*не шукайце дарогі ў шчасце*
*гэта толькі сяброўскі Давід*
*адусюль безупынна сплывае*
*захад сыты ў наш краявід*

*— адазвіся, славянскі народзе,*
*затанцуюць казакі ў полі*
*толькі праўда нас абароніць*
*ад еўрасаюзных сяброўскіх гастроляў*

*на сваім ганарышся сабою*
*на чужым возьмеш нізкі паклон*
*ну падумай — як гора з бядою*
*заараць у еўрапейскі загон*

## *Наш час*

*... ці скажаш: Божа!*
*— яшчэ рана, спяшаць*
*няма куды — дзіця я*
*— даруй мне грэшніку...*
*дазволь пакаштаваць жыцця*

*пакіну слёзы на зямлі*
*сплывуць у родны кут*
*за стыль жыцця сваёй сям'і*
*астаўся як „банкрут”*

*пакінуў бацькоўскі парог*
*ручнік, што на іконе*
*духмяных кветак поўны луг*
*і вецер у прагоне.*

# Ой, зайграйце музыкі

Узрастаючы ў сямейных музычных традыцыях (на баяне іграў бацька Ян, а на акардэоне — дзядзька Віктар), быў я запалонены музыкай з дзяцінства, яна захапіла мяне. І так звыш дзесяці гадоў (1973-1986) бубніў я паклоннікам музыкі, танца і забавы на розных мерапрыемствах. Ужо вучнем-падлеткам граў я з музыкантамі старэйшага пакалення. Бянтэжыла мяне, калі такі сеньёр гаварыў мне звяртацца да яго на „ты”. Граў я таксама ў войску, дзе ў тую самую часць трапіла нас траіх іграючых вучняў аднаго класа Механічнага тэхнікума ў Гайнаўцы. Заснавалі мы новы калектыў, бо стары за недысцыплінаванасць адправілі ў штрафбат у Ожыш. Пасля войска гралі мы ў народным ансамблі, дзе я шырэй знаёміўся з народнай музычнай творчасцю і абраднасцю. З сённяшняй перспектывы бачна, як памянялася музыка і попыт на яе, як змянілася вяселле і абраднасць.

### Халтуры

Музычныя выступленні на забавах, фэстах ці вяселлях разглядалі мы праз камерцыйную прызму, не звяртаючы ўвагі на іх узровень. У 60-х гадах галоўнымі інструментамі капэлы былі баян, педальны гармонік, акардэон, скрыпка і перкусія. З'яўляліся і духавыя інструменты — саксафон або трубка. Электрычная гітара з'явілася крыху пазней. Тэхнічны росквіт прайшла перкусія, даючы перкусістам магчымасць падборкі інструментарыя для сваіх патрэб і ўмеласцей.

### Была мода

Модныя былі паўднёваамерыканскія рытмы — румба, самба ды іншыя. На вясковых забавах царылі неўміручыя польскія і замежныя гіты — „Танга Мілонга”, „Ла Палома”, „Жалюзі”, „Już nigdy”, „Cicha woda” і інш., вясёлыя куплеты, слаўныя вальсы, рускія частушкі ды народныя і эстрадныя беларускія і ўкраінскія песні. Твіст запачаткаваў хвалю рокавых танцаў.

### „Старая музыка”

Аднойчы ў Крывятычах давялося мне граць на „праваслаўнага Сільвестра” любіцелям „старой музыкі” з нашага наваколля разам з пажылым баяністам Валодзем Мураўскім. Дзедка задзівіла мая даволі разбудаваная перкусія і ён з вялікім хваляваннем расказаў мне, як у час сваёй маладосці да вясельных танцаў іграў ён толькі сам. Пазней да баяніста сталі далучацца скрыпач, трубач і барабаншчык, якому кавалак снараднай гільзы заступаў медны дыск, а на бубен была нацягнута вырабленая цялячая або сабачая шкура. Сказаў ён мне таксама, што на веласіпедны абруч нацягалі кажух і такая прылада выконвала ролю бубна. Музыкі не патрабавалі ні электратоку, ні ўзмацняльнікаў, а ўсё-такі ўсе іх чулі.

У пасляваенныя гады ў Орлі і наваколлі было толькі двух музыкаў — Валодзя Мураўскі і мой бацька Ян. Бацька расказваў, што калісь вясельны музыкант быў патрэбны на тры дні. Граў ён дзень да вяселля, калі малады выкупліваў кашулю ад маладухі. Музыкантаў не было многа, таму гадзіць іх на вяселле ці забаву трэба было месяц або і больш загадзя. Музыкант на мерапрыемства ішоў многія кіламетры пяшком,



За перкусіяй — аўтар, 90-я гады

а калі было далекавата, ехаў на ровары. Заплатай за гранне на забаве ў прынцыпе не былі грошы, але, напрыклад, кошык яек, на які складвалася моладзь і пасля забавы даставляла музыканту дадому. Заплатай за гранне на вяселлі быў найчасцей жалязняк дроў. Бывала, што музыканту давалі дадому... крыху каравая. Тады людзям жылося цяжка, а скромная музыка давала не толькі радасць, але і надзею на лепшае.

### Музыка падключаецца пад электраток

У 1960-я гады ў знак пратэсту супраць суроваму сацрэалізму, абмяжоўваючаму натуральнасць і патрэбу пазнавання свету, з'явіліся „bikiniarze” — экстравагантна апранутыя бесклапотныя аматары падпарадкаванай рытму танцавальнай музыкі.

З паловы шасцідзесятых гадоў набірае папулярнасці біг-біт, а ў сямідзесятых — рокавая і папулярная музыка. Галоўныя ролі прымаюць электрычныя гітары: басавая, рытмічная і сольная. Электрыфікаваных музыкаў суправаджаў шалеючы за барабанамі перкусіст. Шалела і публіка: віруючы ўгары пінжакі хлопцаў і піскі дзяўчат.

### Маладзёжная рэвалюцыя

У 60-70-х гадах узорам вельмі папулярных прафесіянальных эстрадных ансамбляў узнікалі ў краіне сотні і тысячы аматарскіх калектываў, якія без аглядкі на мастацкі ўзровень справай гонару ставілі сабе аўтарскавыканаўчую самадастатковасць. Можна сказаць, што рок карэнным чынам змяніў забаву, разбурыў традыцыйныя схільнасці, а ў першую чаргу стаўся пазыўнымі цэлай „маладзёжнай рэвалюцыі”, якая ў року знайшла фортку для выказвання свайго бунту. Моладзь палічыла гэты від музыкі сапраўдным, адлюстроўваючым брыдоту штодзённасці, звычайныя справы і клопаты ды, адначасна, свет яе ўяўленняў перапоўнены песімізмам горкіх тэкстаў.

Моладзь у абмежаваным маштабе дала падтрымку хіпі — захапілася агульнай любоўю і мірам, адвярнулася ад палітыкі, а сваю міралюбівасць сімвалізавала ўручаннем кветак. Быў такі час, што за доўгія валасы можна было апынуцца ў арышце. Помню, што закон ад 1973 года дазваляў насіць доўгія валасы нават у сярэдняй школе, але здаралася, што ацэнкі заніжаліся.

### Вясковыя забавы

У сямідзесятых гадах „народныя” танцавальныя забавы былі найбольш папулярныя ў нас, на Падляшшы. У той час я крыху жыў на Сілезіі, там такіх вясковых гулянняў не было, там моладзь гуляла на дыскатэках і дансінгах. Тады ў нашым рэгіёне амаль у кожнай вёсцы ладзілі патанцоўкі ў святліцах або на драўляных ці бетонных пляцоўках абгароджаных шпалерай бярозак. Хто сёння помніць дрэвы, электраслупы, аўтобусныя прыпынкі ці чыгуначныя станцыі, абклееныя запрашэннямі на адначасовыя забавы ў кожную вёску са святліцай... Гралі і танцавалі ад суботы да панядзелка і пры нагодзе прыхадскіх фэстаў. Буфеты былі багата аснашчаны развесяляючымі напіткамі, апоўначы гучалі шакаладныя вальсы (хлопец быў абавязаны тады купіць партнёрцы шакалад), былі перапынкі для вячэрання аркестра. Прыём аркестру пачаргова ладзілі маладыя людзі і часта такая вячэра была багатым пачастункам для „паловы вёскі”. Такая забава прыцягвала моладзь не толькі з суседніх вёсак, але і з гарадоў, а маладыя людзі сустракаліся не толькі дзеля танцаў, але і каб падабраць партнёра на ўсё жыццё. Прыходзілі і старэйшыя, асабліва жанчыны, займаючы лаўкі навокал пляцоўкі або звонку абступаючы вокны; пасля было пра што плявкаваць: хто з кім гуляў, хто каго абняў, хто як быў апрануты, хто напіўся... Бывала, калі забава прахо-дзіла ў дэпо, то пажарнікі аблівалі заглядаючых у вокны. Часта стары дзедка танцаваў з маладымі ў рытм рок-н-рола ды патрабаваў у аркестра зайграць польку...

Амаль на кожнай забаве здараліся выбрыкі і бойкі: ці то з прыезджымі, ці паміж вёскамі, бывалі і трагічныя выхады. Пазней на большых забавах дзяжурылі міліцыя і карэта хуткай дапамогі. Часта і на вяселлях зрывалі забаву, але тады мы дадавалі „чаду” пераконваючы, што найважнейшая музыка.

Кожная вёска мела ў наваколлі добрую або дурную славу, аднак забава мела сваё абаянне, фарміравала звычаі. З кожнай забавы вярталіся мы змучаныя, з мешанымі пачуццямі, але неўзабаве зноў ехалі да іншых іграць нашу музыку, знаёміцца з новымі мясцовасцямі, традыцыямі, звычаямі, з новымі людзьмі, дзяўчынамі — быў гэта добры час для кавалера.

### Дыскатэкі

Запар з наступам рок-н-рола патрэбы моладзі сталі задавальняць танцавальныя залы — першыя дыскатэкі, называныя таксама маладзёжнымі клубамі, дзе спалучалі механічную музыку з прамымі выступленнямі мясцовых выканаўцаў. З цягам часу дыскатэкі сфарміравалі ўласную субкультуру ідучую ў нагу з усялякімі танцавальна-забаўляльнымі навінамі і накіраваную маладому адрасату. У дыскатэкі пранікли стробаскопавыя лямпы, віруючыя рэфлектары і набор рухомай пластыкі, уводзячыя маладых танцораў у стан экстазу.

### Адміранне забаваў

У 80-х гадах вясковыя забавы сталі аджывацца. Не толькі культурныя змены, але і патрабаванні адміністрацыйных дазволаў затруднялі і знеахвочвалі да забаваў так арганізатараў як і музычныя калектывы. Былі забаронены алкагольныя напіткі, што адняло ў арганізатараў прыход неабходны на аплату ансамбля. Прывяло гэта да таго, што вясковыя святліцы — некалі будаваныя з вялікай дбайнасцю — апусцелі, сталі прытонамі п'яніц, вандалы павыбівалі ў іх вокны. Сёння некаторыя святліцы адрамантаваны, іншыя — напрыклад, клубы сялянна — зніклі беспаваротна.

### Дыска-пола

Грамадскія змены пачатку 90-х гадоў увялі новы від танцаў — вольныя забавы. Прыватная ініцыятыва адкрыла агромныя — на некалькі тысяч асоб — танцавальныя залы, перабудаваныя з колішніх эскаэраўскіх ці школьных будынкаў або новазбудаваныя спецыяльна для гэтых мэтаў. Наступ дыска-пола ахапіў усю краіну, асабліва ўсходнія ваяводствы. Новы від музыкі падмяніў фальклор, калі народная музыка пераехала з вёскі ў горад, губляючы свой абрадавы характар. Варта адзначыць, што пачынальнікамі дыска-пола былі мы, беларусы (калектывы „Грамада”, „Дубіны”). Намнога раней такога віду забаўляльнай музыкай стаў на Захадзе рок-н-рол.

Ёсць прыхільнікі гэтай музыкі, але прыхільнікі цешацца ёю, бо яна прыемная і простая, „пад ножку”, кранае простыя справы і цураецца агрэсіі. Задумоўваюся, ці гэтыя песенькі праз нейкія сто гадоў не будуць аб'ектам доследаў нейкіх будучых Аскараў Кольбергаў канца XXI стагоддзя.

**Міхал Мінцэвіч**

## *Над Супрасляй зямля*

*Над Супрасляй зямля*
*Беларускіх князёў,*
*На душы прылягла*
*Шумам вечных бароў.*

*А даліны лугоў*
*Аксамітны дыван*
*Жыць змушаў сто гадоў*
*І ты зноў: Род твой пан.*

*І ніхто не змяняў*
*Тваіх простых імён,*
*Ты і крыж цалаваў*
*Праваслаўных знамён.*

*Як даўно то было*
*Болей чым пяцьсот лет,*
*Пятна потым лягло*
*Як пракляты прадмет.*

*Як Карона табе*
*Стала ставіць правы,*
*Памяняўся твой лёс*
*З дамы на удавы.*

*Наказалі знак крыжа*
*Класці цэлай рукой,*
*Падзялілі святых:*
*Гэты — мой, гэты — твой.*




*Яшчэ колькі было*
*Зямлі нашай зняваг,*
*Не канчаецца тло*
*Болей скрыты працяг.*

*Над Супрасляй стаіць*
*Манастыр-велікан.*
*Колькі ты пацярпеў.*
*Колькі ты пражыў ран.*

*Цярпеў разам з табой*
*Беларускі народ*
*І цяпер хоць збаўляй*
*Сутаўні, перашкод.*

**Анатоль Парэмбскі, 20.03.2005 г.**

## *Мая мова*

*У маім беларускім слове*
*Сардэчнасці шчырай багата,*
*А слова — мовы аснова,*
*А мова сягоння распятая.*
*А мова — душа народа*
*На ёй песні родныя льюцца,*
*А выродкі без племені, роду*
*Глумяць яе і смяюцца.*
*А мы, апусціўшы рукі,*
*Глядзім, як мова канае,*
*За болі яе і мукі*
*Сурова нас Бог пакарае.*
*Не стане нам літасці боскай,*
*Зракуцца нас родныя дзеці,*
*Распыляцца нат пагалоскі,*
*Што мы існавалі на свеце.*
*Яшчэ нам не позна выйсці*
*За край наш, за родную мову*
*І ўзняць у паднябесныя высі*
*Штандар наш святы Хрыстовы.*
*Хай свет наша гора пабачыць,*
*Хай свет нашы болі пачуе,*
*Як родная мова плача,*
*Як нелюдзь над ёю лютуе.*

**Мікола Грышан (Дзятлава, Беларусь)**

# Родам з Крэсаў




Юрка Буйнюк (усярэдзіне) з інтэрнацкімі сябрамі

Час бяжыць беспаваротна. Хапайма хвіліны, якія з ім адплываюць у прошлае. Мінае ўжо пяты год маёй адукацыі ў вялікім Яновічавым горадзе Беластоку. Не ведаю чаму выбраў я беларускую філалогію, можа таму, што стараюся штосьці рабіць у гэтай дзялянцы, аставіць на нашай падляшскай зямлі малы, але цвёрды след. Цікавасць прымушае пытаць мяне пра рознае. Сам стараюся шукаць адказаў на цяжкія пытанні.

Пачалося ад першага курса, ад кастрычніка, калі на месца жыхарства выбраў я беластоцкі студэнцкі інтэрнат н-р 2. У ім калісьці пражывала мая сваячка, а яшчэ раней дзядзька. Яны прыемна ўспаміналі студэнцкія часы. Лёс звёў мяне ў інтэрнацкім пакоі з карэнным беларусам, з якім адкрывалі мы беларускія шляхі. Пры нагодзе прывучаў я яго дыялектнай мове, што выклікала ў яго своечасовую нацыянальную экстравагантнасць. Пачалі мы размаўляць на беларускай мове ўсюды, і ў інтэрнаце, і на вуліцы, і на універсітэце. Выклікала гэта цікавасць мінаючых нас людзей.

Аднаго разу жанчына, у якой студэнты мяняюць пасцель, пытае: „Jak panu studiuje się w Polsce?" Зрабіў я вялікія вочы ад здзіўлення і пытаю папольску чаму так яна думае. „Bo u pana taki miękki akcent i do tego nazwisko niepolskie". Пачаў я тлумачыць, што я — беларус з Падляшша, а акцэнт... „Вельмі прыемна, што вы заўважылі", — сказаў я.

Год пазней чакаю ў чарзе прызначэння месца ў гэтым жа інтэрнаце. Паміж хлопцамі і дзяўчатамі завязалася размова. Пытае мяне адна знаёмая бландзінка: „A wakacje spędzałeś w Polsce, czy tam, u siebie?" Ну то я ёй нагаварыў, што я з Навагрудка з таго ж горада, што Міцкевіч. Паверыла. Дзяўчаты любяць экзотыку. Пытаю: „A ty skąd pochodzisz?" — „Z Białowieży", — адказала. Далей я не пытаў.

Размаўляў я з маладымі юрыстамі пра Беларусь. „Białoruś nie ma własnej literatury, praw, nawet języka", — пачуў я ў адказ. У чэрвені 2003 года, калі памёр Васіль Быкаў, прыходзіць да мяне ў пакой той самы, што гэта сказаў і каецца ў нацыянальных грахах: „Jurek, miałeś rację, ten Bykau to był wybitny pisarz. Szkoda, że nie dostał Nobla". Хоць адзін зразумеў, як шанаваць іншыя народы.

Такіх гісторый было шмат, але міла ўспамінаю гэтую студэнцкую супольнасць, творчую багему, дзе побач сябе пражываюць беларусы і палякі, музыкі і паэты ды брунеткі і бландзінкі. Усе цікавыя, дзіўныя, смешныя і маладыя. Кожны мае свой свет, а найважнейшае — іншасць, якую трэба шанаваць.

**Юрка Буйнюк**

PS. А што скажуць пра гэта мае сябры з Варшавы, Кракава ці Мінска?

# *Здрада і беларускі дух*

*Нядаўна прачытаў я кніжку рускага публіцыста Юрыя Дружнікава пра Паўліка Марозава (на здымку), які ўславіўся даносамі на сваіх бацькоў і іншых жыхароў зауральскай вёскі Герасімаўка. Не было б сэнсу марнаваць паперу на згадку пра гэта, але трэба ведаць, што Паўлікава сям'я, як і ўсе жыхары ягонай вёскі, выводзілася з карэнных беларусаў. Яшчэ пры цары, у 1906 годзе, сорак суседскіх беларускіх сем'яў па прычыне беднасці і нястачы зямлі выбраліся ў далёкую Сібір у пошуках лепшай долі. Царскія ўлады не шкадавалі абшчаць ім зямлі на неабсяжных прасторах, абы толькі яе засяліць. Такім чынам узнікла і вёска Герасімаўка, названая ад імя найстарэйшага перасяленца Герасіма Сакова. У 1910 годзе да іх далучыліся іншыя перасяленцы, у іх ліку і Сяргей Марозаў з жонкай Ксеніяй, малалетнімі сынамі Іванам і Трафімам ды іншай раднёй. Усе яны былі непісьменныя і небагатыя, працавалі цяжка. Не вывучылі яны рускай мовы і між сабою гаварылі па-беларуску. Трафім удзельнічаў у рэвалюцыі 1917 года, дзе, бадай, здабыў нейкую грамату, таму жыхары вёскі выбралі яго старшынёю сельсавета. Быў ён добрым чалавекам, затое ягоная жонка Таццяна, з якою меў чатырох сыноў — Паўліка, Федзю, Аляксея і Рамана — была гультаінай не дбаючай пра сваіх дзяцей. Таму Трафім развёўся з ёю і пайшоў жыць да іншай, але дзяцей сваіх наведваў.*



*Калі пачалася калектывізацыя, жыхары Герасімаўкі не рупіліся ў калгас, не прадавалі за бясцэнак збожжа дзяржаве, хаваючы яго ў розных схованках перад аматарамі забіраць мужыцкае дабро. Новай уладзе спатрэбіліся даносчыкі і правакатары, таму ў школах сталі гэтаму навучаць. Паўлік, які быў слабым вучнем, неахвотным хадзіць у школу, акрыяў у новых абставінах; шлюючыся па вёсцы вынюхваў каго прадаць. Першым ён прадаў свайго бацьку Трафіма, які таксама хаваў збожжа ды іншых намаўляў да гэтага, а будучы старшынёю сельсавета заступаўся за аднавяскоўцаў, крыўджаных новай уладай; за гэта чэкісты забралі яго на многа гадоў у цяжкі лагер. Ягоная былая жонка Таццяна бадай таксама дапамагала сыну ў гэтай справе помсцячы мужу.*

*Крамлёўскай дыктатуры патрэбны былі даносчыкі для глыбіннага заняволення народа, патрэбны стаў герой для ўслаўлення і ўзгадавання яму падобных, каб бралі з яго прыклад. Паўлік быў ужо вядомы чэкістам у найбліжэйшым наваколлі, таму і выбар героя выпаў на яго. 3 верасня 1932 года Паўліка з братам Федзем знайшлі нежывымі блізка вёскі. Усю віну за гэтую смерць звалілі на „кулакоў", найбліжэйшых Паўлікавых сваякоў: 81-гадовага дзеда Сяргея, 80-гадовую бабулю Ксенію, 70-гадовага дзядзьку Арсеня Кулаканава і 19-гадовага дваюраднага брата Данілу Марозава. Арыштаваных было больш, але іх выпусцілі, затое згаданую чацвёрку паказны суд у лістападзе 1932 года прысудзіў да найвышэйшай меры пакарання. Найбольш віноўным прызналі дзеда Сяргея, бо супраць яго даваў паказанні абвінавачаны дзевятнаццацігодак Даніла; апошняму расстрэл замянілі пажыццёвым цяжкім лагерам.*

*Сёння ўжо вядома, што ўсе падсудныя былі невіноўныя. Крэмль загадаў знайсці ахвяру, якая б скампраметавала ўсіх сібірскіх мужыкоў, якія баяліся калгасаў. Сталін і ягоная кліка добра ведалі, што без даносчыкаў ім будзе тугавата. 3 верасня 1932 года супрацоўнік ГПУ ў Таўдзе Спірыдон Карташоў прыехаў на кані ў Герасімаўку і закалоў штыком вяртаючыхся з лесу братоў-даносчыкаў. Пра гэты ўчынак Карташоў прызнаўся аўтару кніжкі ў 1982-1988 гадах, пахваліўшыся да таго, што ён забіў звыш сарака чалавек, у тым ліку і шмат дзяцей.*

*Пасля забойства братоў Марозавых распачалося ганенне на ўсіх, хто нават крыва глянуў на савецкага чыноўніка. Усіх піянераў і камсамольцаў загналі даносіць на „ворагаў народа". Плён атрымаўся выдатны, бо газеты і радыё сталі навыперадкі публікаваць прозвішчы тых, каго трэба выслаць у лагер або турму. Паўліка сталі выхвальваць савецкія пісьменнікі, а Максім Горкі запатрабаваў паставіць новаму герою помнік пад крамлёўскай сцяною; не ведаў, бедалага, што на яго даносіў ягоны сын, які пасля таямніча загінуў, так як гінулі тыя, якім ён так верна служыў. Такая іронія лёсу ўсіх даносчыкаў і іх памагатых.*

**Мікалай Панфілюк**

# Ne pokidajte ž movy našoji pudlaśkoji...

**Čom ja ode pišu po-svojomu?**

Samy prosty odkaz na siête pytanie — tomu što uvažaju „Nivu” za svoju gazetu. Za gazetu, kotoru čytaju od času, koli mniê było 11-12 lêt i ja šče chodiv do školy v Horodčyni (Narvovśka gmina). I za gazetu, v kotoruj ja zaroblav na chlêb jak žurnalist v 1989-93 lêtach. Tomu ja znaju, što čytačê „Nivy” natôlko hramotny, što mohut pročytati napisane po-svojomu bez velikoji tiažkości, naveť koli dosiôl ni razu siêtoho ne robili.

Perepis ludi v Pôlščy z 2002 roku pokazav, što bliśko 80 procent „perepisanych” biłorusuv na Biłostôččyni — to lude, kotory hovorat po-svojomu, to značyt, naohuł inačej, čym pišetsia v „Nivi”. Po-druhie, perepis pokazav, što biłoruskość na Biłostôččyni, nažal, ciêły čas odstupajetsia i zmenšujetsia. Dosiôl my dumali, što nas u Pôlščy može byti i 200 000, a tut okazałosia, što niê — vsioho 50 000. Nekotory kažut, što 50 000 — to i tak nekiêpśko, bo mohło byti hôrš. Nu i nakład „Nivy” za ostatni 30-40 lêt tože potverdžuje smutnu pravdu, što nas štoraz menš: v 60-tych lêtach prodavałosia 10 000 egzemplaruv gazety, a teper vsioho 2 000.

Čom nam ne začati pisati nekotory artykuły tak, jak hovoryt udoma bôlšość biłorusuv na Biłostôččyni — to značyt, po-svojomu? Chto viêdaje, čy ne pobôlšało b čytačôv „Nivy” sered tych, što literaturnoji biłoruśkoji movy ne naučylisia, bo ne miêli do siêtoho okaziji, ale šče svobôdno hovorat po-svojomu i mohli b po-svojomu čytati, koli b jim chtoś pisav.

**Čom ja ode pišu „pôlśkimi literami”?**

Tomu što ja perekonany, što v Pôlščy vsio menš ludi može svobôdno čytati teksty v kiryličnum alfabeti. Siête kasajetsia i biłorusuv, osoblivo z mołodoho pokolênia, kotory najčaśtiêj ne majut i samoji možnośti naučytisia kirylici, od času jak zo školuv „vyhnali” rosijśku movu i zaminili jijê angielśkoju abo nimećkoju. A daleko ne vsiê ž biłoruśki diêti na Biłostôččyni učatsia biłoruśkoji literaturnoji movy. A značyt, koli dumati považno pro pisanie na našuj pudlaśkuj movi v budučości, to vydajetsia rozumnym odrazu pryniati łaciński alfabet dla siêtoho zaniatku.

Vsiêm vidno, što alfabet, kotory ja ode vykorystovuju do zapisu našoji movy, ne zusiêm „pôlśki”. To pravda, vôn trochu „pôlśki” i trochu „čeśki”. Ja vybrav taki varyjant grafiki, kob, po-perše, maksymalno ekonomično prybližyti zapis našoji movy do jeji fonetyki (ja proponuju, naprykład, oboznačati našy pudlaśki dyftongi jak „ê” i „ô” i odkinuti takije „dovhovaty pôlśki vydumki” jak „cz” i „sz”, zaminiajučy jich „č” i „š”). Po-druhie, mniê chotiêłosia, kob každy, naveť toj, chto nikoli v žyciu ne čuv našoji pudlaśkoji movy, hlanuvšy na jeji zapis, odrazu zrozumiêv, što to akurat je osôbna mova, a ne jakiś „idiolekt” abo jakajaś pôlśko-ruśka miêšanka z ukrajinśkimi otrubami.

**„Język mniejszości” v Ustavi ob nacijonalnych menšośtiach**

Ja ne pišu ode, kob ono rozkazuvati bajki, jakaja dorohaja povinna nam byti naša pudlaśka mova i jak my jijê povinny lubiti. Tut je dviê velmi važny rečy, zviazany z našoju movoju z odnoho boku i z Ustavoju „O mniejszościach narodowych i etnicznych oraz o języku regionalnym” z 6 styčnia 2005 z druhoho boku.

Ustava pozvolaje v tych gminach, de prožyvaje ne menš čym 20 procent biłorusuv, korystatisia „językiem mniejszości” jak „pomocniczym”, okromla pôlśkoji movy. Kažučy konkretno, možna pisati podania na menšosnuj movi i trebovati, kob na



Klejniki ci Kleniki?

takôj samuj movi uradniki gminy čołoviêkovi odkazuvali. Zrozumiêło, što gmina maje oboviazok dati robotu takim uradnikam, kotory menšosnu movu znajut. Vže odčuvajete, kudy ja hnu?

Ot že, takich biłoruśkich gminuv na Biłostôččyni je dvanadceť. Z Horodkom i Narovkoju sprava bôlš-menš zrozumiêła. Chto maje maturu z biłoruśkoji movy z biełliceja, to robotu v siêtych gminach može dostati. Ale što z ostatnimi gminami: Narvovśkoju, Biêlśkoju, Čyžovśkoju, Hajnuvśkoju, Vurlanśkoju, Dubićkoju, Kleščelôvśkoju, Čeremchôvśkoju i našymi dvuma sławnymi horodami, Biêlśkom i Hajnuvkoju? Čy dumajete, što tam našy lude budut masovo hovoryti v gminach na biłoruśkuj literaturnuj movi i pisati na jôj podania? Ja odčuvaju, što vy tože śmijetesia, dojšovšy do siêtoho miêstia...

Kob dla siêtych 10 pudlaśkich gminuv Ustava ne była ono pustym papiêrciom, treba zrobiti našu pudlaśku movu „piśmovoju”, to značyt, takoju samoju normalnoju movoju, na jakôj pišut u „Nivi” tak samo ochvôtno, jak i na biłoruśkuj. A to značyt — bez dyskryminaciji i jakoho-leń movnoho getta v formi „Pudlaśkoji storônki”.

Od „Nivy” treba było b začati, bo učanym i inteligentnym žurnalistam našoji gazety ne bude tiažko trochu napiatisia i od času do času šparnuti artykulčyk po-svojomu i zaochvotiti korespondentuv, kob robili toje same. A koli ministerstva začnut pisati „rozporządzenia wykonawcze” do Ustavy v konkretnych gminach, treba bude jim namiaknuti, što v deseti našych gminach „językiem regionalnym” je pudlaśka mova, a ne biłoruśka literaturna. I pokazati tym ministram „Nivu”, kob pobačyli, jak pudlaśka mova vyhladaje. Bo inačej mohut ne poviêryti, što vona istniêje. Takiej mowy nie ma, obywatele Białorusini! Pokażcie mi jakiś tekst w tej waszej podlaskiej mowie, skoro tak twierdzicie! O tutaj, panie ministrze...

*ZAMIÊTKA: Koli chto ne zusiêm viêdaje, jak pročytati siêty tekst, tomu ja ode podaju skoročanu tabliciu perechodu z łacińskoho alfabetu, kotory užyvaju pry zapisovi našoji movy, do kirylici:*

| | |
|---|---|
| *ć — ць* | *č — ч* |
| *ś — сь* | *š — ш* |
| *ź — зь* | *ž — ж* |
| *ď — дь* | *v — в* |
| *ť — ть* | *w — ў* |
| *ń — нь* | *ê — ыэ (orêch/орыэх)* |
| *ch — х* | *ô — уо (kôń/куонь)* |
| *ł — л* | *l — ль* |
| *li — лі* | *le — ле* |
| *lo — лё* | *lu — лю* |

Vsio siête, jak kažut, proste jak duha. Odno što nam treba dobre popraciovati, kob ne „prośvistati” naohuł korysnu dla nas Ustavu ob menšośtiach. I kob ne skompromitovatisia pered biłorusami v Kleščelach abo Vôrli, trebujučy od jich, kob vony hovoryli v gmini tak, jak Janka Kupała z Jakubom Kołasom. Nechaj kleščelôvci i vurlanci hovorat tak, jak hovoryli od vikôv. Jim treba tôlko skazati, što jichnia mova je druhoju povnopravnoju movoju biłorusuv Biłostôččyny, i pokazati, što na jôj možna pisati. I jakoś jijê nazvati. Ja, zrozumiêło, daju svôj hołos na nazvu „pudlaśka.”

**„Dodatkowe nazwy tradycyjne w języku mniejszości”**

Ustava ob menšośtiach tože pozvolaje nam nazyvati vioski i horody „w języku mniejszości” v vyšêj pereličanych gminach. Znov že, z čysto teoretyčnoho pohladu, nema problemuv v Horodkovi i Narovci. Koli lude schočut, to napišut sobiê dodatkovo Haradok abo Гарадок i Narauka abo Нараўка na dorôžnych tabliciach.

A z pudlašami ne tôlko praktyčny kłopot, kob perekonati ludi do dvuchmovnych tabliciuv. Ode šče i osnovny, tak skazati, filozofičny dylemat. Koli napišemo Вялікія Тынявічы koło Tyniewicze Wielkie, to dumajete, što velmi poradujemo tamošnich ludi? Ni odna, ni druha nazva ne je tradycijnoju. Bo tradycijnoju je Veliki Tinevičy — „zgodnie z zasadami pisowni języka [mniejszości]”, jak trebuje siêtoho Ustava v artykuli 12. A v Tinevičach movoju menšości je svoja mova, a ne biłoruśka literaturna.

Kob ne „prośvistati” Ustavu, što kasajetsia našych historyčnych nazvuv, to treba sobiê jasno i raz navse postanoviti: v dvoch lićvinśkich gminach pišemo nazvy na literaturnuj biłoruśkuj movi, v deseti pudlaśkich — na pudlaśkuj. Jak dla mene, to napis Чыжы falšovav by tradycijnu nazvu vioski ne menš, čym teper falšuje deržavna nazva Czyże. Bo v Čyžach vsie ž znajut, što lude od vikôv kazali na svoju viosku Čyžê (z dyftongom, kotory zaodno zakryplaje akcent na ostatnium składovi).

**Zapoviêt baťkôv — v naślêdstvo diêtium**

V 19 viêkovi Francišak Bahuševič, biłoruśki šlachcic, zvernuvsia do biłoruśkich mužykôv: **Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!** Mužyki, jak i treba było spodivatisia, začali rehotati. Jak śviêt śviêtom, od movy ž nichto ne vmirav, a bez hrošy i chlêba — to šče i jak. A okazałosia, što Bahuševič miêv raciju. Nu bo čy bez biłoruśkoji movy dziś napravdu žyvie Biełaruś? Moža i žyvie, ale co to za życie?

Ot že, koli ja dziś zvoročujusia čerez „Nivu” — Ne pokidajte ž movy našoji pudlaśkoji! — to, majučy za soboju vypadok z Bahuševičom i minułość Biłorusi, ja i ne dumaju apelovati do našych mužykôv. A nechaj vony vže dumajut i robiat, što chočut. Ja hovoru peredovsiêm do našych magistruv i doktorôv z profesorami, kob vony trochu prykinuli mozhami i pomohli perestupiti pudlaśkuj movi poroh „Nivy”, kotory do siêtoji porê byv dla jijê zavysoki. Siête oboviazkovo treba zrobiti. Kob, jak skazav Bahuševič, ne vmerti. I kob, jak kaže moja žônka, raz i navse skônčyti vsiê dyskusiji našych ukrajinciuv pro toje, što takoje biłoruśkie, a što ukrajinśkie na Biłostôččyni. Biłoruśkim je toje, što nam pokinuli v naślêdstvo našy didy i baťki. I toje, što my pokinemo v naślêdstvo svojim diêtium i vnukam.

**Jan Maksimiuk**
**Praha, luty 2005**

**Vesnovy obrad**

Velikdeń, jaki svojim genezisom źviazany z davnim prasłoviańśkim śviatkovaniom vesny, u svojich obradovych motyvach sławiv pryrodu, čołoviêka i joho praciu. Typovy prykład skazanoho — ohulka *Oj, vesna-krasna*. Samo złučenie słôv *vesna-krasna* określuje vesnu jak samu chorošu poru roku. Słovo *krasna* maje paru značeniuv: kolor — čyrvony, u odnosinach chorostva — chorošy, krasivy; u odnosinach vartości - najlêpšy. Krom siêtoho, vesna ščodra:

*Oj, vesna-krasna, čoho ty nam prynesła,*
*Oj, rano rano, čoho ty nam prynesła,*
*Małym ditočkam — po krašonum jiječku,*
*Starym babulkam — po vyšytum čepočku.*

Motyvom krašonoho jiječka ohulka naviazuje do vołočebnych piśeń i obdarovuvania ditej vołočebnym. Zvyčaj siêty zatrativ davni sens, koli vołočebniki peredianhalisie za bohasovnečnych posłańciôv i veśnianyje božestva i chodili do hospodarôv, veličajučy rytualnymi napiêvami bohôv i, odklikajučysie do ich prychilnośći dla zemloroba i joho praci, prosili spohady i pomočy. Bo vsio zaležało od narovuv natury, od pohody, kotora može zapevniti abo źniščyti urodžaj. Vołočebnikami mohli bespôrno byti tôlki kudijê-viêščuny, kotory neposredno służyli boham i zapevniali łučność čołoviêka ź jimi. Pudčas vołočebnoho veličania, na dverach domovin stavilisie rytualny znaki boha-sovnyka — kruh, kruh z kropkoju, kryž, kotory zasterehali žytło od neprychilnych božestv, duchuv i temnych sił. Hromovy znak — kruh z šyśćma špiciami sterôh od małanki. Vołočebnikuv obdarovuvali ščôdro, kob zaručytisie prychilnośćioju bohôv.

Velikodny rytualny veličanni i kultovy piśniê źnikli razom z kudijami i viêščunami, a pameť pro ich nejasno protryvała v velikodnuj okołoobradovuj tradyciji, kotora źliłasie z chryścijanśkoju paschoju. Starożytny kultovy veličanni ustupili miêścia muzyčno prevoschôdnym pravosłavnym voskreśnieńśkim piśniam. Sam velikodnoveśniany obrad napovnivsie piśniami narodnoho bytu, nasyčanymi liryčnymi motyvami lubvi, ślubu, zamužža.

U inšum nastroji utrymana piêśnia:

*Położu kładku verbovu-verbovu,*
*Čas vam divońki do domu, do domu.*
*A ty, Maniečka, tu zostań, tu zostań,*
*Pryde Kolečka, ručku dasť, ručku dasť,*
*Pryveze vina zza mora, zza mora.*
*Byvaj, Maniečka, zdorova-zdorova.*

Vona śpivałasie štodeń na zakunčenie ohulok u adres diêvčyny, kob pryhadati pro lubovne spotkanie. Zamôrśkie vino je symbolom ošołomlajučoji lubvi.

Velikodny piśniê sławili ne tôlko pryrodu, ludej, lubov, ale i samych diêtok:

*Oj tam v lêsi, na dubku,*
*Visit kołyska na šniurku,*
*A v tôj kołyśći Vasilko.*
*Kołyšête joho vysoko,*
*Kołyšête joho vysoko,*
*Kob było vidno daleko.*
*Kołyšut joho až pud bôr,*
*Kob było vidno na pudvôr.*

Piêśnia povna radości z faktu isnovania ditiati, kotorym chočut pochvalitisie, pokazati.

Velikodny obrad kunčavsie *provodnoju nediêloju*.

Vo vtorok byv praźnik duš usopšych — Radosna. Ludi šli na mohiłki, molilisie, śviatili mohiły. V cerkvi na mohiłkach odbyvałasie słužba za upokôj duš usopšych. Nosili paschu, krašany jajcia, palili śvički — symbol prasłoviańśkoho boha Źniča.

Diś povsiudno palat źničy.

**Viktor Stachviuk**
**(frahment z „Sivoji zozuli”)**